Велічны росквіт савецкай культуры — вынік дружбы, узаемнага ўзбагачэння, абмену духоўнымі скарбамі паміж народамі СССР.

Своеасаблівым сімвалам гэтага быў канцэрт работнікаў мастацтваў савецкіх народаў, які адбыўся ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў у дзень закрыцця XXII з'езда КПСС.

Як з мелодый розных краёў складалася чароўная сімфонія гэтага канцэрта, так з песень, музыкі, танцаў розных народаў краіны ствараецца адзінае, магутнае наша мастацтва — нацыянальнае па форме, сацыялістычнае па зместу.

На здымку, які зрабіў наш карэспандэнт у Палацы з'ездаў — прадстаўнікі мастацтва з розных рэспублік — рускія і ўкраінцы, беларусы і ўзбекі, таджыкі і эстонцы...

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

№ 96 (1630) | Аўторак, 5 снежня 1961 года | Цана 4 кап.

ДЗЯРЖАВА—ГЭТА МЫ

Д. ПІНСКАСІК

НА СЦІПЛАЙ вокладцы пяць вогненных слоў: «Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза». Тонкая, невялікага фармату кніжка... Але колькі ў ёй дынамічнай сілы! Які неабсяжны акіян думкі, руху, дзеяння! Які велічны гістарычны маштаб і якую шырокую перспектыву адкрывае яна. Ты чуеш у ёй магутны поступ стагоддзяў. Ты бачыш у ёй і мнагатрудны сённяшні дзень і сонечную далеч. І чым больш учытваешся ў Праграму, тым больш адчуваеш веліч нашага часу.

Глыбока народная ў сваёй аснове і сваёй сутнасці, Праграма нашай партыі са здзіўляючай яснасцю раскрывае сілу народных мас, сутнасць сацыялістычнай дэмакратыі, умацоўвае ў кожным з нас грамадзянскую годнасць і пачуццё гаспадара краіны. Мы — грамадзяне агульнанароднай савецкай дзяржавы. Народ — адзіны яе ўладар. Які цярністы шлях павінна было прайсці чалавецтва, каб вось так перамагла справядлівасць!

НА ХВАЛЯХ народных рухаў узбіралася на п'едэстал гісторыі буржуазія, крычучы, што менавіта яна нясе чалавецтву «свабоду». Цудоўныя словы «свабода», «роўнасць», «брацтва» сталі прадметам нястрымнай спекуляцыі. Буржуазныя палітыкі і ў мінулым і цяпер спрабуюць даказаць, што менавіта капіталістычнае грамадства і буржуазны парламент з'яўляюцца тымі вяршынямі, да якіх імкнулася чалавецтва.

Сутнасць буржуазнай дэмакратыі выдатна ахарактарызаваў Карл Маркс, сказаўшы: прыгнечаным раз у некалькі год дазваляюць рашаць, які менавіта з прадстаўнікоў пануючага класа будзе ў парламенце прадстаўляць і падаўляць іх!

Буржуазныя пісакі, калі б яны былі хоць на ёту больш сумленнымі, даўно перасталі б ламаць коп'і і ламацца ў адчыненыя дзверы. Спрэчка аб тым, што такое сапраўдная дэмакратыя і сапраўдная свабода і хто ўзняў над нашай шматпакутнай планетай іх сцяг, даўно вырашана гісторыяй.

КАСТРЫЧНІЦКАЯ сацыялістычная рэвалюцыя адным махам разбурыла беспадстаўныя доказы буржуазных адвакатаў, быццам палітычнай дзейнасцю могуць займацца толькі нямногія, быццам людзі працы, рабочыя і сяляне ад прыроды пазбаўлены такога дару. Каб абгрунтаваць свае доказы, буржуазія не абмяжоўвалася словамі. Яна, як вядома, пусціла ў ход і ваенныя інтэрвенцыі, і эканамічную блакаду, і дыпламатычнае ігнараванне. Але і гэта не дапамагло. Простыя людзі рэвалюцыйнай Расіі паказалі сваю здольнасць не толькі захапіць уладу, не толькі адстаяць яе, але і ўмацаваць яе, напоўніць непераадольнай, жыватворнай сілай.

Вялікі Ленін кінуў лозунг: кожная кухарка павінна навучыцца кіраваць дзяржавай. Вялікі Ленін, партыя камуністаў не толькі абвясцілі гэты лозунг, але і зрабілі ўсё, каб ён быў ажыццёўлены.

Паглядзіце, з якім веданнем, з якой дзяржаўнай мудрасцю вырашаюць народныя выбраннікі справы ад самых простых, што датычаць жыхароў аднаго сельсавета або адной вуліцы, да самых складаных, што закранаюць інтарэсы ўсёй дзяржавы, яе ўнутранай і знешняй палітыкі. Колькі разоў, бывала, прысутнічаючы на сесіях Вярхоўнага Савета нашай рэспублікі і слухаючы выступленні дэпутатаў, я здзіўляўся шырыні іх поглядаў, уменню аналізаваць сутнасць фактаў і з'яў.

Вось узнімаецца на трыбуну савецкага парламента радавы рабочы Міхаіл Антонік. Электразваршчык Антонік, выдатны майстра сваёй справы, працуе побач са сваімі таварышамі, здавалася б, прывязаны да свайго рабочага месца. Але вось ён пачынае гаварыць і ты адчуваеш, што ён бачыць куды далей за цэх і завод. Ён гаворыць аб патрэбах раёна, затым — аб справах ўсяго горада і, нарэшце, крытычна ацэньвае дзейнасць цэлага міністэрства і яго кіраўнікоў. І ён не толькі канстатуе, ён не толькі крытыкуе, ён і падказвае, як ліквідаваць той ці іншы недахоп, дзе тояцца магчымасці і рэзервы. І міністры, члены ўрада, старанна запісваюць у блакноты заўвагі і прапановы рабочага-дэпутата.

Шмат год я сачу за дзейнасцю дэпутата Мінскага гарадскога Савета педагога па прафесіі Іраіды Дзям'янаўны Фаміцкай. Займаючы адказную пасаду ў Міністэрстве асветы, яна ўвесь свой вольны ад асноўнай работы час аддае выкананню важных дэпутацкіх абавязкаў. Гэтую энергічную, сярэдніх год жанчыну можна бачыць то ў выканкоме Савета, то ў якой-небудзь установе, а часцей за ўсё ў выбарчай акрузе, сярод сваіх выбаршчыкаў. Ці мала клопатаў у народнага выбранніка! То трэба праверыць, ці гатовы дзеці да навучальнага года, то пахадайнічаць аб добраўпарадкаванні вуліцы ці рамонце дома, то паўшчуваць якога-небудзь гаспадарніка, які штосьці абяцаў людзям, але не стрымаў свайго слова. Імем народа, які выбраў яе, Фаміцкая дамагаецца строгага выканання савецкіх законаў, савецкіх норм паводзін і гаспадарання.

У далёкай беларускай вёсцы, што ў Клічаўскім раёне, пазнаёміўся я з калгасным жывёлаводам, дэпутатам Магілёўскага абласнога Савета Зінаідай Апанасаўнай Коршак. Гутарыць з ёю надзвычай цікава, бо валодае яна дзіўнай здольнасцю: у звычайным жыццёвым факце ўмее ўбачыць яна вялікі дзяржаўны сэнс. Гэтую простую жанчыну, якая многа цяжкасцей перажыла на сваім вяку, ведаюць не толькі ў раёне, але і за яго межамі. Калі на сесіі слова просіць дэпутат Коршак, у зале становіцца ціха, бо ўсе ведаюць, што ў прамове, якая зараз прагучыць, будуць і вострыя крытычныя заўвагі, і слушныя прапановы. У вёсках яе ведаюць і стары і малы. Варта ёй дзе з'явіцца, як ідуць і ідуць да яе людзі са сваімі клопатамі, просьбамі, парадамі. І ўсё бярэ яна на заметку — і тое, што магазін гандлюе з перабоямі, і тое, што кінаперасоўка з'яўляецца са спазненнем, і тое, што трэба пра дзіцячыя яслі падумаць... І дэпутат, карыстаючыся сваімі паўнамоцтвамі, што магчыма, уладкоўвае на месцы, а пры неабходнасці ідзе ў выканком Савета, у раённыя, а то і ў абласныя ўстановы, дзе павінны, абавязаны палічыцца з яе патрабаваннямі.

ВОСЬ ЯНА, народная ўлада! Рабочы... Інтэлігент... Сялянка... Народныя выбраннікі ў народных органах улады. Каля 80 тысяч дэпутатаў прадстаўляюць сваіх выбаршчыкаў у Саветах Беларусі. 80 тысяч дзяржаўных дзеячоў, якія ўпаўнаважаны народам і выказваюць волю народа! Дэпутаты — перадавыя людзі грамадства і разам з тым радавыя члены грамадства, нашы таварышы па рабоце, якія працуюць разам з намі. Вось яна, сапраўдная дэмакратыя!

Што можа супрацьпаставіць гэтым фактам так званы «свабодны» свет капіталізму? У ЗША, дзе налічваецца больш 50 мільёнаў рабочых, служачых і працоўных фермераў, у кангрэсе няма ніводнага рабочага, ніводнага дробнага фермера.

Максім Горкі назваў савецкую дэмакратыю самай яркай дэмакратыяй зямлі. Мы з'яўляемся сведкамі таго, як святло яе становіцца ўсё больш моцным. Праграма партыі прадугледжвае далейшае ўмацаванне і пашырэнне дэмакратычных асноў у дзейнасці Саветаў.

У Праграме КПСС замацавана практыка, якая склалася ў жыцці, у дзейнасці Саветаў і будзе развівацца, удасканальвацца. З чаго пачынаюць цяпер работу сесіі многіх Саветаў? Кіраўнікі выканкомаў даклад ваюць дэпутатам, як выкананы рашэнні папярэдняй сесіі. А вось як робяць у Вілейскім раёне. У вызначаны дзень члены выканкома раённага Савета, кіраўнікі раённых арганізацый выязджаюць у адну з вёсак. Тут яны робяць справаздачу перад выбаршчыкамі аб сваёй дзейнасці, затым адказваюць на пытанні. Рэагаванні на крытычныя заўвагі надоўга не адкладваюцца. Многія недахопы ліквідуюцца на месцы. Гэта і ёсць дэмакратыя ў дзеянні. І чым далей, тым шырэй яна будзе ахопліваць усе сферы нашага жыцця.

Возьмем, скажам, дзяржаўны апарат. Ён верай і праўдай служыць народу. Ён самы даступны для працоўных, самы дэмакратычны ў свеце апарат. Але партыя лічыць неабходным удасканальваць яго, паляпшаць. Партыя лічыць неабходным і далей развіваць дэмакратычныя асновы ў кіраванні. Партыя ў сваёй новай Праграме ставіць задачу: неабходна весці справу к таму, каб дзяржаўны платны апарат скарачаўся, каб навыкамі кіравання авалодвалі ўсё больш шырокія масы і работа ў гэтым апараце ў перспектыве перастала быць асабовай прафесіяй.

ПЕРСПЕКТЫВА гэтая — не за дальнімі гарамі, яна ўжо бярэ пачатак у нашай сённяшняй, штодзённай дзейнасці. Хіба для супрацоўнікаў пазаштатнага аргінструктарскага аддзела Пінскага гарвыканкома работа ў апараце з'яўляецца прафесіяй? Вядома, не. Яны дзейнічаюць на грамадскіх асновах, бясплатна, не па службовым абавязку, а па загаду сэрца. І як працуюць! Няма ў загадчыка гэтага аддзела Фёдара Якаўлевіча Дзенісевіча ні кабінета, ні тым больш прыёмнай. Але людзі яго знаходзяць, а часцей за ўсё ён іх знаходзіць — сёння на якім-небудзь прадпрыемстве, заўтра ў якім-небудзь жылым доме. Ён інструктуе, падказвае, раіць, рэкамендуе. Яго слухаюць, яго рэкамендацыі выконваюць, бо воля грамадскасці даўно ўжо набыла ў нас законную сілу.

Пінск — не выключэнне. У свой час у выканкомах Саветаў дэпутатаў працоўных раёнаў і невялікіх гарадоў былі ліквідаваны гандлёвыя аддзелы. Хто ж павінен правяраць і накіроўваць работу гандлёвых прадпрыемстваў? І вось у многіх месцах узніклі пазаштатныя гандлёвыя аддзелы. Супрацоўнічаюць у іх не толькі спецыялісты гандлю, але і рабочыя, настаўнікі, хатнія гаспадыні. Яны кіруюць гандлем, правяраюць, прымаюць захады... І спраўляюцца са сваімі абавязкамі. Спраўляюцца не горш, а часам і лепш, чым ранейшыя штатныя аддзелы.

Навыкамі дзяржаўнага кіравання і грамадскай дзейнасці савецкія людзі авалодваюць у шматлікіх самадзейных арганізацыях працоўных. Часта мы бачым неспакойных людзей, якія просяць нас выйсці ў двор на нядзельнік. Гэта члены вулічнага камітэта. У памяшканні домаўпраўлення засядае другая група грамадскіх актывістаў — выбраны намі дамавы камітэт слухае справаздачу домаўпраўляючага. Наш таварыш па рабоце або сусед па кватэры зрабіў ганебны ўчынак — і вось ён стаіць перад судом таварышаў — самым суровым і справядлівым судом. Вось мы бачым, як рабочыя хлопцы з чырвонымі павязкамі на руках уціхамірваюць хулігана — гэта члены добраахвотнай народнай дружыны сочаць за грамадскім парадкам. Саветы пенсіянераў... Жаночыя саветы... Бацькоўскія камітэты... Саветы пры ўстановах культуры... Дзесяткі самадзейных арганізацый. Парасткі будучага камуністычнага самакіравання. У іх сотні тысяч працоўных праходзяць школу кіравання, праходзяць добраахвотна, з радасным пачуццём абавязку, які яны выконваюць перад грамадствам.

УСЕ ГРАМАДЗЯНЕ кіруюць дзяржавай... Сказана проста і неяк будзённа, але які глыбокі сэнс закладзены ў гэтых словах. Які вялікі і нялёгкі шлях трэба было прайсці, каб можна было іх з такой вось яснасцю і цвёрдасцю абвясціць. Прыгадаем вогненыя гады рэвалюцыі і народных хваляванняў. Прыгадаем, з якой бурнай смеласцю ўрываўся рэвалюцыйны матрос у Зімовы палац і з якой нясмеласцю ён першы раз садзіўся за стол, атрымаўшы першы ў жыцці дзяржаўны пост. Прыгадаем першыя пасяджэнні сельвыканкомаў пад свіст кулацкіх куль і халодныя вечары вучобы ў рабфаках...

Мы вучыліся і навучыліся. Праз гады выпрабаванняў пранеслі мы высока ўзняты Леніным сцяг свабоды. Магутнай дзяржавай свету стала першая ў гісторыі дзяржава працоўных, якая вырасла на абломках самадзяржаўя. Вялікая садружнасць нацый і народаў... Высокаарганізаваная садружнасць людзей працы... Людзі працы паспяхова кіруюць гэтай дзяржавай у інтарэсах і на карысць усяго грамадства. І Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў меў поўную падставу з высокай трыбуны гістарычнага з'езда партыі заявіць усяму свету: «Кожны рабочы, кожны селянін, кожны інтэлігент можа сказаць: «дзяржава — гэта мы...»

ПАСЛЯ З'ЕЗДА — ВЯЛІКІЯ ЗАДАЧЫ

Адбыўся адкрыты сход партарганізацыі Міністэрства культуры БССР. Дэлегат XXII з'езда партыі, міністр культуры Р. Я. Кісялёў выступіў з дакладам аб выніках работы з'езда і задачах работнікаў міністэрства.

Вялікую ўвагу ў сваім выступленні дакладчык аддаў задачам партыйнай арганізацыі Міністэрства культуры, якія вынікаюць з рашэнняў XXII з'езда КПСС.

Начальнік планава-фінансавага аддзела Галоўнага ўпраўлення кінафікацыі і кінапракату М. Парамонаў расказаў пра тую вялікую работу, якую трэба правесці ў бліжэйшыя гады ў галіне кінафікацыі. Ён крытыкаваў аддзел капітальнага будаўніцтва Міністэрства культуры за дрэннае будаўніцтва аб'ектаў культуры.

Я. Рамановіч — намеснік начальніка Упраўлення па справах мастацтва — гаварыў пра тыя вялікія задачы, якія неабходна вырашыць работнікам мастацтва ў сувязі з рашэннямі XXII з'езда КПСС.

Сакратар партбюро Міністэрства культуры В. Ляонцьеў адзначыў, што ў рэспубліцы дрэнна наладжана культурнае абслугоўванне дзяцей. У Брэсцкай вобласці быў лялечны тэатр, але цяпер ён спыніў сваю работу. А Упраўленне па справах мастацтва мірыцца з падобным становішчам.

На сходзе выступілі і іншыя таварышы. Усе выступленні былі прасякнуты адзіным імкненнем — працаваць яшчэ лепш, як патрабуе жыццё.

Удзельнікі сходу горача ўхвалілі рашэнні XXII з'езда КПСС, Праграму і Статут партыі, а таксама адкрытае і рашучае асуджэнне з'ездам культу асобы Сталіна.

Партыйны сход абавязаў партбюро ўсімі сродкамі палітычнай і арганізатарскай работы давесці вялікія ідэі XXII з'езда КПСС і Праграму партыі да кожнага работніка міністэрства, каб змест, сэнс і сутнасць Праграмы ведаў кожны камуніст, кожны работнік. Трэба мабілізаваць творчыя сілы апарату на практычнае ажыццяўленне задач камуністычнага будаўніцтва, на выкананне прынятых сацыялістычных абавязацельстваў.

З думкай пра заўтрашні дзень

Калектыў Рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага разам з усім савецкім народам з вялікім хваляваннем сачыў за работай гістарычнага XXII з'езда КПСС.

Нядаўна ў тэатры адбыўся адкрыты партыйны сход. Аб выніках XXII з'езда з дакладам выступіў дэлегат з'езда, міністр культуры БССР Р. Я. Кісялёў.

Сход прайшоў надзвычай актыўна, з глыбокім роздумам пра заўтрашні дзень нашага тэатра. Што і як мы будзем ставіць у наступным годзе?

Я. Палосін звярнуў увагу ў сваім выступленні на рэпертуар тэатра. Рыхтуюцца зараз пакуль толькі два спектаклі: «Адзін год» (рэжысёр М. Співак) і «Беспасажніца» (рэжысёр В. Рэдліх). Далейшы рэпертуарны план яшчэ не вызначаны. У бліжэйшы час неабходна мець план пастановак на ўвесь 1962 год з тым, каб выпускаць за год 7—8 спектакляў, замест 4—5, як гэта рабілася ў апошні час.

Р. Качаткоў заклікаў калектыў тэатра павышаць майстэрства, дамагацца высокага ідэйнага і эмацыянальнага гучання кожнага спектакля. У гэтай сувязі, на яго думку, неабходна павысіць адказнасць мастацкага кіраўніцтва тэатра за якасць пастановак.

Рэжысёр М. Співак адзначыў, што Міністэрства культуры БССР яшчэ не глыбока цікавіцца творчым жыццём тэатра і мала памагае яму ў канкрэтных пытаннях.

Амаль усе, хто выступаў на сходзе, гаварылі аб неабходнасці перабудовы работы тэатра, звярнуўшы асаблівую ўвагу на рэпертуар, адпаведны сённяшняму этапу камуністычнага будаўніцтва.

Калектыў поўны творчай энергіі і сіл, каб дастойна выканаць новыя, больш высокія задачы.

Г. АБУХОВІЧ,
сакратар партарганізацыі тэатра, народная артыстка БССР.

З'ЕЗДАЎСКІЯ ЧЫТАННІ

У мінскіх кінатэатрах створаны лекторый па прапагандзе матэрыялаў і рашэнняў XXII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Кінатэатр «Мір», будаўнічае вучылішча № 25 і мінскае гарадское Таварыства па распаўсюджанню палітычных і навуковых ведаў праводзяць кіналекторый на тэму: «Камунізм — гэта маладосць свету і яго будаваць маладым!» Будуць прачытаны лекцыі: «Маральны кодэкс будаўніка камунізма», «У жыцці заўсёды ёсць месца подзвігам», «Дарогу да зорак пракладваюць камуністы», «Што такое шчасце і як за яго змагацца», паказаны кінафільмы «Два жыцці», «Чыстае неба», «Зноў да зорак» і іншыя.

Кінатэатр «Перамога» наладжвае з'ездаўскія чытанні з адначасовай дэманстрацыяй хранікальна-дакументальных і навукова-папулярных фільмаў.

У масавых бібліятэках горада праводзяцца канферэнцыі чытачоў, тэматычныя вечары, гутаркі аб маральным кодэксе савецкага чалавека — будаўніка камунізма. Падабрана адпаведная літаратура, створаны спецыяльныя аддзелы ў дапамогу вывучаючым матэрыялы XXII з'езда КПСС.

ХТО ЛЕПШ, ХТО ЦІКАВЕЙ...

Іх у рэспубліцы 2 200! Дзве тысячы дзвесце згуртаваных, дружных і надзвычай рухавых самадзейных калектываў, кожны з якіх мае ў сваім складзе не больш 15 выканаўцаў. Што ж, яны напэўна даюць вясёлыя, забаўныя канцэрты, пацяшаюць гледачоў? Аказваецца, не зусім так. Гэтыя маленькія калектывы аматараў — агітацыйна-мастацкія брыгады, і сэнс іх выступленняў куды больш значны і мэтанакіраваны, чым толькі паказ на сцэне свайго майстэрства ў песнях і танцах.

Несці ў шырокія народныя масы вялікія ідэі нашай партыі, услаўляць подзвігі герояў працоўных будняў, змагацца сродкамі сатыры і гумару супраць перажыткаў мінулага, выхоўваць у людзей рысы новай камуністычнай маралі — вось якія задачы вырашаюць сёння шматлікія мастацкія агітбрыгады Беларусі. Самае ж галоўнае — тое, што іх удумлівая і непаўторная яркая творчасць звязана з мясцовым жыццём, і ўся праграма заўсёды будуецца на жывых рэальных фактах таго калгаса, дзе выступаюць самадзейныя артысты.

Агітбрыгады — зусім новы, спецыфічны від самадзейнага мастацтва. Многа тут яшчэ няяснага і няпэўнага: і сам характар складання праграмы, і формы выканання, падачы розных яе нумароў і г. д. Усе шукаюць, вынаходзяць, спрабуюць, стараючыся быць па-свойму арыгінальнымі і надзённымі. Вось чаму вельмі своечасовым з'явілася правядзенне першага рэспубліканскага агляду мастацкіх агітбрыгад, які ўступіў у свой рашаючы заключны этап.

18 лепшых і найбольш падрыхтаваных творчых калектываў, будучы пераможцамі абласных аглядаў, цяпер прыехалі ў Мінск, каб паказаць сваю актуальную самабытную творчасць на сталічнай сцэне. Ужо выступалі мастацкія брыгады Брэстчыны і Гомельшчыны, Віцебшчыны і Гродзеншчыны, а аддаць каму-небудзь з іх большую перавагу і знайсці адразу канкурэнта на першае месца — проста пакуль немагчыма. Немагчыма таму, што кожны з гэтых «партатыўных» калектываў выступае, як кажуць, у сваім «амплуа», мае ўласнае творчае аблічча, сваю манеру выканання, якая не падобна на папярэднікаў. І гэта ставіць у цяжкае становішча журы агляду: хто з іх усё ж выступае лепш, хто цікавей?

...Яшчэ не рассунулася заслона, а ў глядзельную залу ўжо льецца задушэўная мелодыя папулярнай «Рэчыцкай лірычнай». А вось і самі выканаўцы — вясёлая група юнакоў і дзяўчат, якія дружна і зладжана спяваюць на поўны голас:

Неба ўсё у зорачках
Свеціць дываном,
Мы з агітбрыгадаю
Едзем над Дняпром.
Зоркі ваду чыстую
Не нап'юцца — п'юць,
Навокал пра Рэчыцу
Родную пяюць.

І гледачы без абвяшчэння здагадваюцца, што перад імі — агітбрыгады Рэчыцкага гарадскога Дома культуры. Уся праграма яе выступлення задумана і пабудавана як тэатралізаваны агляд «Дзед Мярэжа праўду рэжа» (аўтары — мастацкі кіраўнік А. Фінкільберг, інструктар-масавік В. Сакалоў і метадыст РДНТ А. Радзівілаў). Заснаваны на мясцовым канкрэтным матэрыяле з жыцця калгасаў Рэчыцкага раёна, гэты цікавы агляд выглядае цэласным і завершаным па драматургіі. Тут няма ніводнага ўстаўнога нумара; усе песні, танцы вынікаюць непасрэдна з самога зместу твора, звязаны з развіццём сцэнічнага дзеяння.

Галоўны герой агляду — вясёлы і дабрадушны калгасны вартаўнік дзед Мярэжа (выхавацель дзіцячага сада В. Васіленка). Заўсёды востры на язык, непрымірымы да ўсіх недахопаў, дзед злосна высмейвае разам з удзельнікамі агітбрыгады ўсё старое, што аджывае свой век, не дае спуску гультаям, п'яніцам і лайдакам. У гэтым аглядзе не толькі мастацкае слова, але і кожная песня, частушка на сваім месцы: у адным выпадку яны ўслаўляюць выдатных калгасных працаўнікоў, такіх, як ільнацерабільшчык І. Кулеш, брыгадзір саўгаса «Ведрыца» С. Фешчанка, а ў другіх — крытыкуюць асобных людзей за абыякавае стаўленне да калгаснага дабра і бяздзейнасць у працы. Асабліва дасціпная песня аб нядбайных кукурузаводах на матыў «Ой, хацела ж мяне маці...» (выканаўца — інструктар гаркома камсамола Л. Сыч). Песня «Рэчыцкая лірычная» акаймоўвае ўвесь агляд і служыць таксама ў ім своеасаблівым музычным эпілогам.

З дасціпным тэатралізаваным аглядам «Тарас не на Парнасе, а ў суседнім калгасе» пазнаёміла мінчан Рагачоўская агітбрыгада, зрабіўшы яго ў духу вядомай беларускай ананімнай паэмы. Тарас — абагулены вобраз калгаснага працаўніка з адстаючай сельгасарцелі «Рассвет», які, выпадкова трапіўшы ў суседні калгас імя Леніна, дзіву даецца, як людзі дружнай калектыўнай працай

(Заканчэнне на 4-й стар.).

Хораша, з пачуццём гумару спявае ўдзельніца Баранавіцкай агітбрыгады Марыя Калоша.

Выступае Шарашэўская агітбрыгада (Пружанскі раён).

Дваццацігоддзе вялікай перамогі пад Масквой

3 снежня ў Цэнтральным Доме Савецкай Арміі імя М. В. Фрунзе адбыўся вечар, прысвечаны 20-годдзю разгрому нямецка-фашысцкіх войск пад Масквой.

Даклад аб разгроме захопнікаў пад Масквой зрабіў двойчы Герой Савецкага Саюза, генерал арміі Д. Д. Лелюшэнка.

З успамінамі на вечары выступілі былыя воіны і партызаны. Яны расказалі аб гераічных подзвігах, здзейсненых у баях пад Масквой.

ПРАВА НА ПРАЦУ

Фотаэцюд Ул. КРУКА.

У гродзенскіх літаратараў

Сёлета члены Гродзенскага абласнога літаратурнага аб'яднання напісалі новыя творы, прысвечаныя XXII гістарычнаму з'езду КПСС і нашай гераічнай сучаснасці.

У «Гродзенскай праўдзе» апублікавана пяць літаратурных старонак, складзеных з лепшых твораў літаратараў Гродзеншчыны, а таксама пяць падборак з вершамі маладых паэтаў А. Перагуда, Г. Шутэнкі, В. Блакіта, Л. Казачэўскага і Я. Булыкі.

Члены літаб'яднання выступалі на літаратурных ранішніках і вечарах перад вучнямі школ Гродна і вёсак Селіванаўцы і Капцёўка, перад студэнтамі інстытутаў, слухачамі народнага універсітэта, воінамі гарнізона. Асабліва часта сустракаюцца з чытачамі Васіль Быкаў, Алесь Карпюк, Валянцін Чэкін, Апанас Цыхун, Ірына Паўловіч і інш. На чарзе выступленне літаратараў перад студэнтамі Гродзенскага медыцынскага інстытута.

Днямі ў чытальнай зале бібліятэкі імя Ажэшка адбыўся чарговы многалюдны сход аб'яднання. Інспектар райана Апанас Цыхун зрабіў даклад аб творчасці студэнта Гродзенскага педагагічнага інстытута Алеся Дземідовіча.

Я. ЯЎСЦІГНЕЕЎ.

ЧАС НОВЫХ ЗДЗЯЙСНЕННЯЎ

Заір АЗГУР,
дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, народны мастак рэспублікі.

Наш дэмакратычны лад дае магчымасці разгортвання творчых сіл усяго народа. У гэтым глыбіня і сутнасць нашай савецкай дэмакратыі, якая праяўляецца ўсюды і ва ўсім, у прыватнасці ў рабоце Саветаў. Саветы дэпутатаў працоўных—гэта ўвасабленне сапраўднага народаўладдзя, якое для нас завяявалі ў 1917 годзе нашы бацькі. Мы сёння з гонарам гаворым, што выдатныя дасягненні нашай навукі і тэхнікі з'яўляюцца вынікам творчасці народа, які сам кіруе вялікаю дзяржавай рабочых і сялян.

Мне думаецца, што трэба, і не раз, напамінаць нашым сынам і дочкам, што жывуць яны ў цудоўную, дзівосную пару. Наша моладзь ужо шчаслівая тым, што не адчула жахаў капіталістычнага прыгнёту, не ведае яна і тых пакут, якія вынеслі мы ў цяжкую гадзіну Вялікай Айчыннай вайны, змагаючыся са злейшым ворагам чалавецтва — фашызмам. Нашы дзеці жывуць у мірных умовах, дзяржава дала ім усё для росквіту талентаў, для творчай працы і вучобы.

Урад краіны Саветаў робіць усё магчымае, каб народы жылі ў міры і дружбе, каб не было вайны. Мне хочацца яшчэ раз напомніць маладым, што мірнае суіснаванне — гэта вынікі ажыццяўлення Канстытуцыі нашай дзяржавы.

Калі моладзь будзе ўважліва і ўдумліва чытаць творы савецкіх пісьменнікаў, наведваць выстаўкі выяўленчага мастацтва, глядзець спектаклі аб нашых сучасніках, слухаць музыку савецкіх кампазітараў, дык яна ўбачыць, пачуе і сэрцам адчуе, якая сапраўдная свабода прадастаўлена савецкаму чалавеку і якая цудоўная мірная песня лунае над нашай Радзімай і колькі ў ёй гарачага, шчырага закліку да міру і дружбы.

Вось чаму нам, дзеячам літаратуры і мастацтва, такое дарагое наша свята — Дзень Канстытуцыі. Вось чаму мы пра яго заўсёды натхнёна гаворым і штодзённа ў справах сваіх аллюстроўваем вялікую сутнасць самага дэмакратычнага, самага справядлівага ладу на зямлі.

Цяпер, пасля XXII з'езда партыі, пасля здзяйляючых па сваёй глыбіні і шырыні ахопу падзей дакладаў М. С. Хрушчова, пасля таго, як партыя прыняла Праграму пабудовы камунізма, хочацца працаваць яшчэ лепш, яшчэ больш плённа. Удумайся, чытач, як поўна і ярка паказаны ў гэтых гістарычных дакументах шлях, пройдзены савецкім чалавекам, якія светлыя перспектывы адкрывае перад табой блізкае камуністычнае Заўтра. Найвялікшая заваёва партыі камуністаў—новая Праграма КПСС — з'яўляецца асновай нашага жыцця, яна забяспечвае імклівы рух наперад творчым сілам савецкіх народаў.

Хіба магла б падумаць і ўявіць сабе мая маці—простая жанчына-працаўніца, і мой бацька, ламавы вознік, што іх сыну народ акажа вялікае давер'е — выбера дэпутатам Вярхоўнага Савета рэспублікі, што Савецкая ўлада, наша Канстытуцыя прадаставяць яму магчымасць вучыцца і ён стане скульптарам, што на сесіях Вярхоўнага Савета рэспублікі разам з рабочымі і калгаснікамі, дзеячамі літаратуры і мастацтва, вучонымі, урачамі, настаўнікамі ён будзе абмяркоўваць і вырашаць важнейшыя пытанні жыцця народа.

У кожным кутку нашай рэспублікі ведаюць імя сціплай працаўніцы калгаснай вёскі—даяркі, дэпутата Вярхоўнага Савета Беларусі Лідзіі Іванаўны Асіюк. Яшчэ не так даўно гэта была цёмная, забітая сялянка, якіх было многа на «крэсах усходніх», дзе гаспадарылі польскія паны і капіталісты. І як можа акрыяць душа чалавечая, калі перад ёй адкрыць дарогу да творчай працы! Цяпер Лідзія Іванаўна многа і старанна працуе, і праца зрабіла яе знатным чалавекам нашай рэспублікі. Калі слухаеш яе ўдумлівую, па-сялянску нетаропкую гаворку, дзіву даешся, адкуль столькі развагі, адкуль такі дзяржаўны падыход пры вырашэнні надзённых пытанняў? Цудаў, як вядома, на свеце не бывае. У дадзеным выпадку гэта—адзін з тысяч прыкладаў, як наша Савецкая Канстытуцыя абуджае да жыцця творчыя сілы народа.

Гэтак жа узрадаваў мяне і лёс простага конюха Мікіты Батоўкіна, якому народ аказаў самае высокае давер'е, выбраўшы яго дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР. Гэта было яшчэ да Вялікай Айчыннай вайны. Многа разоў я сустракаўся з гэтым разумным, па-народнаму мудрым чалавекам. Ён пазіраваў мне, а я ляпіў яго партрэт. За работай, за цікавымі размовамі непрыкметна бег час. Калі быў закончан яго партрэт, я з хваляваннем паказаў яго свайму герою. Ён доўга ўглядаўся ў скульптуру, а пасля нечакана сказаў:

— Ты, Заірка, вылепіў конюха і кожны пазнае мяне на гэтым партрэце. А цяпер зрабі так, каб відно было, што я яшчэ і дэпутат.

Значыць, не ўлавіў я ў той час нейкую важную рысу яго характару, не ўбачыў у ім дзяржаўнага дзеяча, не ўдыхнуў гэтую рысачку ў кавалак гліны, калі ляпіў партрэт. І горка, і крыўдна было тады мне, але ў той жа час і радасна! Просты чалавек, конюх і даў такую правільную, глыбокую ацэнку рабоце скульптара-прафесіянала. З народных крыніц растуць вось такія зсілкі, крылы якіх распасцёрліся для вялікага палёту толькі пры Савецкай уладзе. І як шкада, што гэты самабытны чалавек не дажыў да нашых дзён. Колькі б ён зрабіў, як парадаваў бы кожнага, хто з ім сустракаўся.

У маёй майстэрні пазіравалі людзі розных прафесій: і калгасніцы—Героі Сацыялістычнай Працы—Е. Кухарава, А. Стыкут, А. Гарэцкая, і пісьменнікі, і рабочыя, і акцёры, і героі партызанскай барацьбы, і многія, многія іншыя. Я ляпіў іх партрэты, падоўгу гутарыў.

Асабліва запомніліся мне размовы з калгаснікамі-гераінямі. Я цікавіўся іх працоўнымі подзвігамі, а яны ў час рабочых сеансаў не давалі магчымасці засяроджана працаваць, бо дзяліліся сваімі ўражаннямі аб прачытаных кнігах «На ростанях» і «Дрыгве» Я. Коласа, «Аповесці аб сапраўдным чалавеку» Б. Палявога. І колькі ў іх словах было назіральнасці, той народнай мудрасці, якой так нестае часам нашым крытыкам. Усё цікавіла гэтых працаўніц калгасных палёў: і падзеі за рубяжом і нашы поспехі. А колькі пытанняў яны задавалі! Іх цікавіла, напрыклад, чаму толькі ў гарадах павінны быць музеі, помнікі, карцінныя галерэі. Яны распытвалі, якая розніца паміж сімфанічнай, опернай і народнай музыкай... Гэтыя гутаркі ў майстэрні былі своеасаблівым універсітэтам, яны ўзаемна ўзбагачалі нас. Я расказваў тое, што ведаў, у сваю чаргу пра многа даведваўся і ад іх.

Здзіўляла і радавала шырыня кругагляду гэтых людзей, гордае пачуццё гаспадароў жыцця, гаспадароў дзяржавы нашай. І гэта не было самалюбаваннем і зазнайствам. Не, то была цвярозая ацэнка сваіх сіл, сваіх магчымасцей і запатрабаванняў.

Наколькі такія сустрэчы карысны кожнаму мастаку, можна меркаваць ну хоць бы з наступнага прыкладу. Не памятаю дакладна, хто пазіраваў тады ў майстэрні, ды гэта, зрэшты, і не так важна. А было гэта так. Убачыўшы, што я захапіўся і празмерна доўга вылепліваю хустачку і кофту маёй гераіні, дэпутатка не вытрымала і зрабіла мне заўвагу:

— А гэта, Заір Ісакавіч, можна зрабіць заўтра, а мо калі-небудзь яшчэ, бо сукенкі, як і хусткі, мяняюцца...

Гэтага было дастаткова, каб зразумець, што і ў жыцці, і ў творчасці галоўным з'яўляецца чалавек, а не атрыбут.

З шматлікіх сустрэч і шчырых гутарак з героямі маіх твораў я пераканаўся, што ў савецкага чалавека-працаўніка, чалавека-валадара прыроды, незалежна ад таго, дзе б ён ні працаваў, ёсць адна абсалютна ясная і гордая думка: я—грамадзянін Савецкага Саюза! Адчуванне чалавечай годнасці, адчуванне гаспадара краіны трывала і навечна ўвайшло ў свядомасць савецкага чалавека, стала арганічнай патрэбай яго душы. А калі такі чалавек, натхнёны велічнымі планамі нашай партыі, бярэцца будаваць камуністычнае грамадства, то ён гэта будзе рабіць, як сапраўдны гаспадар, дбайна і клапатліва.

Як дэпутат Вярхоўнага Савета рэспублікі я сустракаюся са сваімі выбаршчыкамі. Будучы ў Рагачове, я чытаў у Доме культуры лекцыі аб выяўленчым мастацтве. Ішла ў нас гаворка і пра беларускі жывапіс, скульптуру, графіку і іх майстроў. Сустракаўся з дзецьмі, гутарыў з выхаванцамі школы-інтэрната. Хутка зноў паеду да сваіх выбаршчыкаў.

З гэтых сустрэч я вынес адно, пра што, на маю думку, варта гаварыць. У першыя пасляваенныя гады дэпутату даводзілася аддаваць шмат увагі разгляду розных скарг і часцей за ўсё на парушэнне норм савецкага жыцця. Усё гэта было непасрэдным вынікам культу асобы. Цяпер, калі партыя назаўсёды пакончыла з гэтай ганебнай з'явай у нашым жыцці, падобныя скаргі, ды і розныя іншыя, дэпутат атрымлівае толькі зрэдку. Значыць, народнаму выбранніку трэба шукаць новыя формы сувязі з выбаршчыкамі.

Сёння сувязь дэпутата з выбаршчыкамі павінна праяўляцца, як мне здаецца, у клопатах аб задавальненні духоўных запатрабаванняў народа. Шчырая, задушэўная гутарка дэпутата з выбаршчыкамі аб сённяшнім і заўтрашнім дні нашай Радзімы, аб узнёслай працы савецкіх людзей, аб маральным кодэксе будаўніка камунізма і далейшым развіцці культуры народа, аб ліквідацыі розніцы паміж горадам і вёскай, паміж разумовай і фізічнай працай,—вось той далёка не поўны паралік праблем, якія, на маю думку, павінны ў першую чаргу хваляваць дэпутата.

Карацей кажучы, дэпутат усёй сваёй дзейнасцю абавязан дапамагаць народу ажыццяўляць велічную Праграму будаўніцтва камунізма, прынятую XXII з'ездам КПСС.

ТЭАТР НА СЦЭНЕ—СУЧАСНІКІ

Новую п'есу «Выгнанне блудніцы» І. Шамякіна мы ўбачылі ўпершыню ў пастаноўцы Тэатра імя Я. Коласа. Напярэдадні XXII з'езда партыі гэтая назва з'явілася на афішах Рускага тэатра імя Горкага.

Чым жа зацікавіла п'еса тэатр? Сваёй навізной.

Калі ў іншых п'есах аўтары часта накіроўвалі сваю ўвагу на так званыя «вытворчыя» канфлікты, дык у «Выгнанні блудніцы» мы сустракаемся галоўным чынам з маральна-этычнымі праблемамі, духоўным ростам працаўнікоў калгаснай вёскі. І няхай яшчэ ў спектаклі Рускага тэатра ёсць недаробкі ў вырашэнні асобных сцэн і вобразаў, не заўсёды адчуваецца глыбокі план, аднак у ім ёсць галоўнае: правільнае раскрыццё характараў, акрылёных радасцю працы, якая з'яўляецца асновай жыцця савецкага чалавека.

Добра, што рэжысёр В. Рэдліх не імкнецца да знешняга «наватарства». Праўда, пастаноўшчык часам спакушаецца такімі чыста знешнімі «эфектамі», як цані, што закрываюць заслону, дэкарацыі, якія нечакана высоўваюцца з бакавых куліс, бярозка, якая часам адцягвае ўвагу гледача. Але В. Рэдліх добра разумее, што сапраўднае наватарства перш за ўсё выяўляецца ў глыбокіх пачуццях чалавека, у раскрыцці яго цудоўных духоўных якасцей. Іменна такія рысы наватарства мы бачылі ў спектаклі. З кожнай новай сцэнай мы нёяк бліжэй і бліжэй пазнаём герояў спектакля, пачынаем іх любіць, хваляваць за іх лёс.

І перш за ўсё сэрцы гледачоў кранае лёс калгаснай даяркі Галі.

Галя ў выкананні Л. Весніной—шчырая, простая. Нягледзячы на сваю прастату, сціпласць і стрыманасць, яна багатая душой, справядлівая ў сваіх адносінах да людзей. У яе паводзінах мы бачым светлы розум, чалавечнасць, яна не бачыць сваёй радасці ў жыцці без сваіх сяброў, свайго калгаса. У той жа час Галя — жанчына з гонарам, з характарам. Светлай радасцю напоўнены яе вялікія адкрытыя вочы. Але вось у вачах Галі паказаліся першыя слёзы. Яны ідуць з глыбіні душы маладой жанчыны, якая памылілася ў сваім першым каханні. Галя быццам застыла, яна не гаворыць ніводнага слова, але мы разумеем яе пакуты, адчуваем боль душы. Што рабіць?

У гэты крытычны момант актрыса знаходзіць правільны ключ да сэрца сваёй гераіні. Гора не зламала Галю. Яна выйшла пераможцай з таго выпрабавання, у якім апынулася. Яна ціха, без шуму пакідае мужа, ідзе не з апушчанай, а з узнятай галавой. І ніякія просьбы не могуць утрымаць Галю. Інакш зрабіць яна не магла. Галя ўпэўнена ідзе ў вялікае, кіпучае жыццё, ідзе разам са сваімі сябрамі-калгаснікамі.

Такі вобраз Галі стварае Л. Весніна. Але вобраз Галі быў бы значна глыбейшы, калі б Л. Весніна не збядніла яго аднатоннымі інтанацыямі. Не заўсёды адчувае артыстка і другі план ролі, а іншы раз іграе вынік замест дзеяння.

Другі цэнтральны вобраз спектакля — настаўнік-паэт Гаворка (І. Шаціла). Гэта цікавы вобраз нашага сучасніка з характэрнымі асаблівасцямі і нацыянальнымі рысамі. Гаворка не сузіральнік, а змагар за новае жыццё. Яму да ўсяго справа, ён змагаецца за радасць і шчасце чалавека, якія ён бачыць не толькі ў дабрабыце, але і ў эстэтычных запатрабаваннях людзей калгаснай вёскі. За гэта ён вядзе і бой са старшынёю калгаса Карначом (Р. Качаткоў), пускае вострыя стрэлы ў свайго сябра-дырэктара школы Яснікава, парывае дружбу з Яўгеніяй Любаміраўнай. Гаворка сее добрыя зерні ў сэрцах савецкіх людзей. Артыст І. Шаціла імкнецца зрабіць учынкі і паводзіны свайго героя дзейснымі і пераканаўчымі. Праўда, гэта яшчэ не заўсёды яму ўдаецца. Раптам жывая нітка вобраза абрываецца і перад намі, замест страснага, жывога чалавека—рэзанёр, які губляе непасрэднасць, шчырасць, народную мудрасць, характэрную для гэтага чалавека.

Удача драматурга і акцёра Я. Палосіна з'яўляецца вобраз дзеда Піліпа. Здаецца, што пасля А. Ільінскага, які так самабытна і ярка, з высокім густам і майстэрствам паказаў гэты вобраз у спектаклі коласаўцаў, цяжка што-небудзь дадаць і знайсці новае. І ўсё ж Палосін знаходзіць. Знаходзіць не ў знешніх трыках і «эфектах», якімі іншы раз любіць злоўжываць акцёр, а ў раскрыцці характару гэтага цудоўнага чалавека.

Шчыра і праўдзіва выконвае ролю маці Галі артыстка В. Захарава, глядач верыць учынкам і словам актрысы, бо яны ідуць з глыбіні душы.

Пераканаўчы вобраз калгасніцы Надзі намалявала артыстка М. Кузьменка.

Хочацца адзначыць працу артыста Р. Качаткова над роллю старшыні калгаса Карнача. Артыст творча прачытаў сваю ролю. Ён бачыць не толькі сённяшні, але і заўтрашні дзень свайго героя, чалавека, якому калгасныя справы даражэйшыя за ўсё на свеце.

Адказная роля ў падзеях спектакля адведзена Яўгеніі Любаміраўне (А. Шах-Парон). Гэтая драпежная мяшчанка жыве філасофіяй — бяры ад жыцця ўсё, што можна. І яна бярэ. Учора «пакахала» паэта Гаворку, сёння Яснікава—будучага вучонага. Не важна, што яе «каханне» разбурае сям'ю, прыносіць людзям пакуты. Такой яна выпісана аўтарам, такой мы і бачым яе на сцэне.

І ўсё ж хочацца зрабіць адну заўвагу артыстцы, якая малюе сваю гераіню некалькі аднастайна. Нам здаецца, што ў Яўгеніі Любаміраўны ёсць свае сумненні, хваляванні, радасці і няўдачы, перажыванні. На жаль, гэтых адценняў мы не бачым у яе характары.

Не пашанцавала ў спектаклі Яснікаву, ролю якога выконвае С. Галуза. Усе намаганні вопытнага акцёра ўзбагаціць вобраз жывымі дэталямі не прынеслі патрэбных вынікаў. Вобраз Яснікава застаўся непаўнацэнным, бяскрылым. Гледачы не разумеюць, што ён за настаўнік, што за вучоны, і наогул, што гэта за чалавек, які ў яго маральны кодэкс.

Радуе праца маладых акцёраў —Ю. Сцяпанава (манцёр Іван), М. Ключнікавай (даярка Маша), Э. Аўчыннікавай (Ліпа) і інш.

Ёсць у гэтым спектаклі і іншыя няўдачы. І не толькі ў выканаўцаў, але і ў працы рэжысёра В. Рэдліх. Расцягнутая экспазіцыя першага акта, не знойдзена вырашэнне карціны лекцыі, у якой гледачы не бачаць ніводнага твара акцёра і інш.

Але першая сустрэча Рускага тэатра імя М. Горкага з І. Шамякіным была плённай і карыснай. Будзем спадзявацца, што і надалей тэатр, разам з лепшымі п'есамі рускіх аўтараў і братніх рэспублік, будзе працаваць з беларускімі драматургамі.

Ул. СТЭЛЬМАХ.

Сцэна са спектакля «Выгнанне блудніцы». У ролях: Гаворкі — артыст І. Шаціла (справа), Яснікава—артыст С. Галуза.

З КРЫНІЦ ЖЫВАТВОРНЫХ

Мікалай ГРЫНЧЫК

ДА 70-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ М. БАГДАНОВІЧА

Выключную ролю ва ўсталяванні перадавых творчых прынцыпаў у беларускай літаратуры пачатку XX ст. адыгралі нашы народныя песняры — Янка Купала і Якуб Колас. Іх паэтычная творчасць як вышэйшае дасягненне беларускай нацыянальнай культуры разам з лепшымі літаратурнымі традыцыямі арганічна ўвабрала ў сябе і найбольш каштоўныя элементы фальклору—яго гуманістычную, вызваленчую накіраванасць, багацце і самабытнасць яго паэтычных форм і жанраў.

У рэчышчы дэмакратычных традыцый беларускай літаратуры фарміраваліся ідэйна-эстэтычныя погляды маладога Багдановіча. Пачынаючы ўжо з першых літаратурных спроб («Музыка», 1907), паэт з пазіцый фальклорнай эстэтыкі падыходзіць да вырашэння праблемы актыўных адносін мастацтва да рэчаіснасці. Прызначэнне сапраўднага мастацтва, — па думцы аўтара, — «грозна будзіць ад сну» працоўныя масы, заклікаць да расправы над «усімі крыўдзіцелямі народа».

Аднак паэту не адразу ўдалося стаць на шлях плённага выкарыстання народнай творчасці. Так, у перыяд 1908—1910 гг. адначасова з выдатнымі ўзорамі пафаснай грамадзянскай лірыкі («Мае песні», «З песняў беларускага мужыка», «Над магілай мужыка» і інш.) М. Багдановіч стварае даволі вялікі цыкл вершаў на так званыя міфалагічныя тэмы. Гэты нечаканы паварот паэта да «міфатворчасці» некаторыя крытыкі доўгі час трактавалі як вынік сімвалістычных уплываў. Аднак разгляд ранніх вершаў цыкла «У зачараваным царстве» прымушае да выводу, што «міфатворчасць» М. Багдановіча сваімі асноўнымі элементамі вынікала з агульнай рэалістычнай канцэпцыі маладога пісьменніка. Творча пераасэнсоўваючы народныя міфы, паданні, легенды, напаўняючы іх новым эмацыянальна-псіхалагічным зместам, паэт імкнуўся надаць ім выразнае рэалістычнае гучанне. У вершах Багдановіча паэтычны вобраз пазбаўлен якіх-небудзь містычных адценняў. Тут трактоўка старажытных народных уяўленняў пададзена з пазіцый сучаснасці — умоўнасць фантастычных вобразаў лесуна, вадзяніка, русалкі і іншых адчуваецца вельмі выразна. У пейзажных замалёўках гэтыя вобразы поўнасцю зліваюцца з рэалістычнымі малюнкамі прыроды (бура, мяцеліца і інш.) і з'яўляюцца арыгінальным сродкам паэтызацыі прыроды.

Нельга не заўважыць і слабых бакоў ранніх фальклярыстычных пазіцый паэта, які абмяжоўвае сябе запазычаннямі з найбольш старажытных, архаічных пластоў беларускага фальклору, слаба звязаных з вызваленчымі веяннямі свайго часу. Адчуваючы аднабаковасць сваіх захапленняў, Багдановіч пачынае паступова пераадольваць «вузкі этнаграфізм» (тэрмін Багдановіча), некалькі суб'ектыўную трактоўку народных міфаў, імкнучыся да больш шырокага творчага выкарыстання фальклору. Вобразы старажытнай міфалогіі ў такіх вершах, як «Пугач», «Лясун» («Я спакойна думаю...»), прыкметна губляюць сваё вузкаэстэтычнае значэнне прыёму своеасаблівай каларытнай дэкарацыі і набываюць новыя ідэйна-сэнсавыя функцыі.

Працэс творчага пераасэнсавання фальклорнага матэрыялу праявіўся і ў многіх іншых вершах Багдановіча 1910—1911 гг. («Мая душа», «Дождж у полі і холад», «Імгла», «Разгарайся хутчэй, мой агонь, між імглы» і інш.). Творча выкарыстоўваючы традыцыйныя прыёмы адухаўлення і гіпербалізацыі, паэт надае гэтым пейзажным замалёўкам зусім новы план асэнсавання: адлюстраванне з'яў і малюнкаў прыроды цяпер не самамэта, а толькі своеасаблівая форма выяўлення аўтарскіх адносін да актуальных грамадскіх праблем. І ў гэтым нельга не адчуць праяўлення найбольш плённых традыцый гагачаснай беларускай лірыкі, у першую чаргу лірыкі Купалы і Коласа. Эстэтычны ідэал паэта ўвасоблен цяпер у рамантычным вобразе вольналюбівага героя, поўнага творчых сіл і ўнутранага гарэння, гатовага да актыўнага дзеяння, да барацьбы.

Далейшая эвалюцыя фальклярыстычных інтарэсаў Багдановіча адбываецца ў сувязі з агульным паглыбленнем эстэтычных поглядаў паэта. Калі раней, напрыклад, у апавяданні «Музыка» праблема народнасці літаратуры трактавалася ў крыху абстрагаваным плане агульнагуманістычнага закліку «да свету, праўды, брацтва і свабоды», то цяпер яе вырашэнне паэт звязвае з актуальнымі задачамі нацыянальна-вызваленчага руху народных мас Беларусі. Так, у адным з першых сваіх літаратурна-крытычных артыкулаў «Глыбы і слаі» Багдановіч з пазіцый рэвалюцыйна-дэмакратычнай эстэтыкі падыходзіць да ацэнкі сучаснай яму паэзіі. Асноўным крытэрыем вартасці літаратурнага твора ён лічыць адзінства высокіх ідэйных якасцей і адпаведнай мастацкай формы. У некрасаўскім духу гучыць вядучы тэзіс артыкула: «Пясняр перш за ўсё павінен быць грамадзянінам». Ясна ўсведамляючы вялікую грамадзянскую місію літаратуры, Багдановіч заяўляў: «Наша пісьменнасць... ніколі не пойдзе чысціць боты капіталу!»

На аснове пераасэнсавання сваіх ранейшых фальклярыстычных пазіцый і творчага засваення народна-песеннай традыцыі М. Багдановіч пераходзіць да распрацоўкі тэм, звязаных з некаторымі інтымнымі праяўленнямі чалавечай псіхалогіі (цыкл «Згукі бацькаўшчыны», 1911). Аднак М. Багдановічу цяжка было здзейсніць гэтую задуму ва ўсім яе ідэйна-эстэтычным комплексе. Адарваны ад жывых крыніц творчасці — беларускай рэчаіснасці, ён не здолеў адразу вылучыць найбольш істотныя праяўленні народнага характару. У большасці вершаў названага цыкла амаль не знайшлі свайго адбітку канкрэтныя сацыяльна-бытавыя дэталі жыцця тагачаснай беларускай вёскі.

Паглыбленае вывучэнне рэчаіснасці і ўстанаўленне непасрэдных жывых кантактаў з беларускімі пісьменнікамі, актыўны ўдзел у літаратурна-грамадскім жыцці — усё гэта плённа ўплывала на развіццё яго ідэйна-эстэтычных поглядаў і творчага метаду М. Багдановіча. Паэт паступова пераадольвае захапленне этнаграфічнымі бакамі фальклору, усё больш набліжаецца да асэнсавання гістарычнай ролі фальклору ў развіцці нацыянальнай культуры беларускага народа. Праўда, погляды Багдановіча на гэтыя надзвычай складаныя пытанні не маглі скласціся адразу, яны знаходзяцца ў стане фарміравання, а таму і выяўлены часткова і, бадай, не зусім поўна ў паэтычнай практыцы пісьменніка.

У аснове вершаванага цыкла «Старая Беларусь» ляжыць ідэя сцвярджэння заканамернасці зараджэння і развіцця беларускай нацыянальнай культуры, ідэя беражлівых адносін да культурнай спадчыны мінулага. Разам з іншымі рэвалюцыйна-дэмакратычнымі пісьменнікамі Багдановіч паэтызуе і высока цэніць працу невядомых летапісцаў, перапісчыкаў, услаўляе веліч гэтага своеасаблівага, часта неўсвядомленага подзвігу. Часам помнікі старажытнасці ў паэтычных уяўленнях Багдановіча выклікаюць зусім новыя асацыяцыі. Так, у вядомым вершы «Слуцкія ткачыхі» старажытная Беларусь — не толькі край чароўных краявідаў, але і край сацыяльных кантрастаў і захаванай напружанай барацьбы. У супрацьлегласць сцвярджэнням буржуазных нацыяналістаў аб ілюзорным «залатым веку» ў феадальнай Беларусі Багдановіч сілай сваёй творчай інтуіцыі прыходзіць да выводу аб наяўнасці дзвюх плыняў у развіцці нацыянальнай культуры — народнай, дэмакратычнай і варожай ёй культуры пануючых класаў. Мастацкае самавыяўленне народа, на думку паэта, — арганічная духоўная патрэба, сведчанне яго невычэрпных творчых і маральных сіл. Менавіта пад уплывам глыбокіх патрыятычных пачуццяў у сэрцах прыгонных ткачых зараджаецца неадольнае жаданне выявіць свой душэўны стан, адлюстраваўшы «радзімы васілёк»:

І тчэ, забыўшыся рука,
Заміж персідскага узору,
Цвяток радзімы васілька»

Відавочна, што алегарычны вобраз «васілька» сімвалізуе тут народныя, фальклорныя вытокі нацыянальнага мастацтва. Творчасць народа трактуецца аўтарам не як маўклівы, хай сабе і каларытны помнік старажытнасці, а як жывая, вечна маладая і дзейсная форма выяўлення народнай самасвядомасці. Ва ўмовах магутнага прыліву нацыянальна-вызваленчага руху ў Беларусі пачатку XX ст. пазіцыя аўтара цыкла «Старая Беларусь» носіць востра палемічны характар, сваім вастрыём яна накіравана супраць тых, хто адмаўляў гістарычныя перспектывы развіцця беларускай нацыянальнай культуры.

Фарміраванне эстэтычных поглядаў Багдановіча на гэтым этапе адбываецца пад сталым і ўсё ўзрастаючым уплывам рэвалюцыйна-дэмакратычнай эстэтыкі Купалы і Коласа. Калі раней, напрыклад, у артыкуле «Глыбы і слаі», грамадскую значнасць мастацкага твора паэт ацэньваў з пункту гледжання паказу народнага побыту і яго сувязей з фальклорам, то цяпер асноўным крытэрыем народнасці ён лічыць ступень рэалістычнага адлюстравання народнага жыцця. У артыкуле «Новы перыяд у беларускай літаратуры» Багдановіч пісаў, што не адным толькі «...літаратурным меркаваннем вычэрпваецца значэнне... твораў... не меншую цікавасць павінны ўяўляць тыя абставіны, што, па-першае, гэта белетрыстыка ідзе з народ, па-другое, што яна ідзе з наро-

Дэкада самадзейнага мастацтва

Калегія Міністэрства культуры БССР прыняла пастанову аб правядзенні разам з ЦК ЛКСМБ і Белсаўпрофам у снежні 1962 года ў Мінску Дэкады самадзейнага мастацтва. У Дэкадзе прымуць удзел калектывы і індывідуальныя выканаўцы мастацкай самадзейнасці, прызнаныя лепшымі на абласных аглядах.

У сувязі з гэтым калегія Міністэрства культуры абавязала начальнікаў абласных і Мінскага гарадскога ўпраўленняў культуры, загадчыкаў гарадскіх і раённых аддзелаў культуры разам з камсамольскімі і прафсаюзнымі органамі правесці ў кастрычніку — лістападзе 1962 года раённыя, гарадскія і абласныя агляды мастацкай самадзейнасці.

У пастанове ўказваецца, што перыяд падрыхтоўкі і правядзення аглядаў на месцах і Дэкады мастацкай самадзейнасці ў Мінску неабходна максімальна выкарыстаць для паляпшэння работы культурна-асветных устаноў, дзейнасць якіх павінна быць падпарадкавана прапагандзе матэрыялаў XXII з'езда КПСС, узмацненню камуністычнага выхавання працоўных і мабілізацыі іх на паспяховае ажыццяўленне задач камуністычнага будаўніцтва. Абласныя і Мінскае гарадское ўпраўленне культуры, Упраўленне культасветустаноў міністэрства абавязаны правесці ва ўсіх абласцях і Мінску 10—15-дзённыя семінары кіраўнікоў калектываў усіх відаў самадзейнага мастацтва, наладзіць дзейсную арганізацыйную і творчую дапамогу самадзейным калектывам і мясцовым аглядным камісіям па падрыхтоўцы да аглядаў і Дэкады, прыцягваючы для гэтай мэты хармайстраў, балетмайстраў, рэжысёраў, кампазітараў, вядучых артыстаў тэатраў, работнікаў упраўленняў культуры і дамоў народнай творчасці.

Дырэктары тэатраў і канцэртных арганізацый павінны наладзіць шырокую кансультацыйную дапамогу калектывам аматараў, дапамагчы ім у падборы высокамастацкага сучаснага рэпертуару, заказаць для іх новыя інструментальныя і харавыя творы.

Калегія Міністэрства культуры вырашыла прасіць Беларускае тэатральнае таварыства, Саюзы кампазітараў і мастакоў, каб яны накіравалі ў вобласці і раёны на працягу падрыхтоўчага перыяду не менш 50 работнікаў мастацтва для аказання творчай дапамогі мастацкай самадзейнасці.

Прынята пастанова аб арганізацыі ў 1962 годзе месячных курсаў павышэння кваліфікацыі мастацкіх кіраўнікоў раённых і гарадскіх дамоў культуры.

Многае прадстаіць зрабіць па падрыхтоўцы да Дэкады Рэспубліканскаму Дому народнай творчасці. Ён павінен падрыхтаваць да выдання рэпертуарны зборнік твораў малых форм (апроч драматычных) на сучасную тэматыку для мастацкай самадзейнасці, накіраваць у вобласці метадыстаў і пазаштатных кансультантаў для аказання практычнай і метадычнай дапамогі калектывам аматараў.

Белдзяржвыдавецтву даручана выпусціць да 1-га красавіка 1962 года рэпертуарны зборнік твораў на сучасную тэматыку для мастацкай самадзейнасці.

СЁННЯ ГЭТА—ГАЛОЎНАЕ!

У Мінску адбылася рэспубліканская нарада загадчыкаў раённых і гарадскіх аддзелаў, начальнікаў абласных упраўленняў культуры. Абмяркоўваліся задачы культурна-асветных устаноў рэспублікі ў святле рашэнняў XXII з'езда КПСС.

З дакладам на гэтую тэму выступіў міністр культуры БССР Р. Я. Кісялёў.

Дакладчык і прамоўцы, што выступалі ў спрэчках, гаварылі пра тыя задачы, якія стаяць перад кожным работнікам культуры па прапагандзе велічнай праграмы пабудовы камуністычнага грамадства.

За апошні час у рабоце ўстаноў культуры як у горадзе, так і на вёсцы, праяўляецца вялікая ініцыятыва грамадскасці.

Толькі ў сталіцы рэспублікі, як адзначыў у сваім выступленні начальнік Мінскага гарадскога ўпраўлення культуры М. Жукоўскі, створаны на грамадскіх асновах універсітэт культуры, музычная школа, 13 бібліятэк. Такая бібліятэка працуе ў Фрунзенскім раёне. Звыш дзвюх тысяч тамоў кніг прынеслі сюды чытачы. У арганізацыі грамадскай бібліятэкі пры домакіраўніцтве № 1 Ленінскага раёна прынялі актыўны ўдзел многія пісьменнікі. Яны падарылі бібліятэцы звыш пяцісот сваіх кніжак з аўтографамі. Пры домакіраўніцтве № 1 Савецкага раёна на грамадскіх асновах створан універсітэт культуры. Вялікую дапамогу ў яго рабоце аказвае Саюз кампазітараў.

Праўда, побач з гэтым адзначалася, што Саюзу пісьменнікаў, Беларускаму тэатральнаму таварыству і Саюзу мастакоў варта было б адкрыць пры сваіх творчых арганізацыях універсітэты па прапагандзе літаратуры, твораў мастацтва і жывапісу.

— Мы маем шмат цікавых прыкладаў пачыну грамадскасці ў рабоце нашых бібліятэк і клубаў,— адзначыў начальнік Мінскага абласнога ўпраўлення культуры Ю. Міхневіч. — Трэба гэту ініцыятыву нам падтрымліваць і развіваць.

Далей прамоўца расказвае пра дзейнасць клубаў сяброў кнігі, пра змястоўныя тэматычныя вечары ў Барысаве, Пухавічах і Старых Дарогах, якія праводзяцца з удзелам актывістаў па прапагандзе новай Праграмы нашай партыі.

М. Шаўчук — начальнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення культуры — расказвае, што на Брэсцчыне сягоння працуе каля трохсот хатніх бібліятэк. Ён гаворыць і пра новыя формы вучобы работнікаў культуры. Так, напрыклад, на базе Пінскага гарадскога Дома культуры арганізавана пастаянная практыка для загадчыкаў сельскіх клубаў і дамоў культуры вобласці. На працягу месяца тут працуе і вучыцца па шэсць чалавек.

— У Скідзелі напярэдадні XXII з'езда партыі, — расказвае начальнік Гродзенскага абласнога ўпраўлення культуры С. Панько, пачаў працаваць на грамадскіх асновах гарадскі аддзел культуры. Ён узначаліў культурна-асветную работу раённага цэнтра. Сёння ў бібліятэках Гродзеншчыны працуюць 2 133 кніганошы, 2 626 пазаштатных прапагандыстаў літаратуры.

Перад удзельнікамі нарады выступіла загадчыца Талькаўскай сельскай бібліятэкі Пухавіцкага раёна Т. Кандрацьева. Яна на яркіх прыкладах работы актывістаў бібліятэкі паказала, што можна зрабіць пры дапамозе грамадскасці. Паслугамі бібліятэкі карыстаюцца 1 550 чытачоў, 60 чалавек з'яўляюцца прапагандыстамі бібліятэчнай кнігі. Гэта — спецыялісты сельскай гаспадаркі, вучні старэйшых класаў, настаўнікі.

Пра неабходнасць больш шырокага ўдзелу ў культурна-асветнай рабоце грамадскасці, прафсаюзных і творчых арганізацый, кіраўнікоў і спецыялістаў сельскай гаспадаркі, устаноў і прадпрыемстваў слушна гаварылі ў сваіх выступленнях начальнік Галоўнага ўпраўлення кінафікацыі і кінапракату міністэрства П. Жукоўскі, начальнік Галоўнага ўпраўлення забеспячэння С. Габрылян, навуковы супрацоўнік Беларускага дзяржаўнага мастацкага музея Э. Варашылаў, загадчык Клімавіцкага раённага аддзела культуры П. Гамолка, загадчык Гомельскага раённага аддзела культуры Я. Руманоўскі.

Удзельнікі нарады адзначылі, што Рэспубліканскі метадычны кабінет культурна-асветнай работы падчас неаператыўна абагульняе і распаўсюджвае новыя пачынанні і ініцыятыву грамадскасці.

Справядліва на нарадзе гаварылася, што некаторыя бібліятэчныя і клубныя работнікі яшчэ не прывыклі шукаць новыя формы і метады прапаганды літаратуры.

Загадчык Полацкага раённага аддзела культуры тав. Васіленка звяртае ўвагу на неабходнасць паляпшэння падрыхтоўкі кадраў работнікаў культуры. Ён гаворыць, што часта можна сустрэць выпускніка Гродзенскага культасветвучылішча, які прэтэндуе на пасаду дырыжора хору, але іграць ні на адным музычным інструменце ён не можа. «Я магу толькі адным пальцам на піяніна»,—заяўляе такі выпускнік пра свае музычныя веды. Трэба ў культасветвучылішчы прымаць тых, хто мае неабходныя здольнасці і любоў да выбранай прафесіі.

Узнімалася пытанне і аб шырокай падтрымцы пачыну работнікаў кінасеткі Нясвіжскага раёна, якія выступілі 13 кастрычніка г. г. на старонках газеты «Літаратура і мастацтва» з заклікам уключыцца ў сацыялістычнае спаборніцтва за высокапрадукцыйнае выкарыстанне і выдатную эксплуатацыю кінатэхнікі, за павелічэнне тэрміну службы апаратуры, абсталявання, перасоўных электрастанцый і фільмаў, за выдатны паказ карцін насельніцтву.

У заключэнне нарады дэлегат XXII з'езда КПСС Р. Я. Кісялёў па просьбе прысутных падзяліўся сваімі ўражаннямі аб рабоце з'езда, адказаў на шматлікія пытанні.

Удзельнікі нарады адзінадушна прынялі рэзалюцыю, у якой намечаны меры па шырокай прапагандзе рашэнняў і матэрыялаў XXII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Заўсёды ёсць наведвальнікі ў цэнтральным кніжным магазіне г. Гомеля. Сюды прыходзяць рабочыя, служачыя, навучэнцы, каб набыць новую кнігу і папоўніць уласную бібліятэку. На здымку вы бачыце аматара літаратуры токара «Гомсельмаша» Ларысу Фядзюшыну ў кніжным магазіне. Фота зрабіў наш пазаштатны карэспандэнт М. Уладзіміровіч.

НОВЫЯ КАЛГАСНЫЯ КЛУБЫ

У вёсцы Прусы Капыльскага раёна нядаўна здадзен у эксплуатацыю новы клуб з глядзельнай залай на 300 месц. У ім размясцілася бібліятэка, ёсць пакоі для работы гурткоў мастацкай самадзейнасці. На адкрыцці клуба пабывалі шэфы калгаса «Шлях камуны» — рабочыя Мінскага мотавелазавода. Разам з удзельнікамі мастацкай самадзейнасці Цімкавіцкай сярэдняй школы імя Кузьмы Чорнага яны наладзілі цікавы канцэрт.

Новыя клубы пабудаваны таксама ў сельгасарцелях імя Леніна і Калініна. Завяршаюць будаўніцтва клубаў у калгасах «Семежава», «Бальшавік».

М. СЯЎРУК.

ПАСЛЯ З'ЕЗДА НАШ ДЭВІЗ—НЯСПЫННА ШУКАЦЬ

Гэты прыгожы будынак ведаюць усе мінчане. Тут Дзяржаўная бібліятэка БССР імя Леніна — буйнейшы культурны цэнтр рэспублікі. Каля трох мільёнаў тамоў кніг па розных галінах ведаў на яе паліцах і ў кнігасховішчах. Нядаўна бібліятэка пашырылася — пабудаван яшчэ адзін корпус, у якім размясціліся новыя чытальныя залы і кнігасховішча.

Наш карэспандэнт папрасіў намесніка дырэктара Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Леніна Іраіду Аляксандраўну Санкову расказаць чытачам газеты аб тым, якія мерапрыемствы правядзе калектыў работнікаў бібліятэкі па прапагандзе новай Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і матэрыялаў XXII з'езда КПСС.

— Гэтае пытанне шырока абмяркоўвалася ва ўсіх аддзелах бібліятэкі і на адкрытым партыйным сходзе, — сказала тав. Санкова. — Увесь наш калектыў творча паставіўся да гэтай надзвычай важнай справы. Паступіла шмат цікавых і слушных прапаноў. Мы прыкладаем усе намаганні, каб найбагацейшыя кніжныя скарбы бібліятэкі зрабіць здабыткам шырокіх працоўных мас.

Дзейсным сродкам прапаганды кнігі з'яўляюцца кніжныя выстаўкі. У бібліятэцы адкрыта выстаўка «Вялікая праграма пабудовы камунізма». На ёй экспануецца разнастайная літаратура ў дапамогу выкладчыкам, прапагандыстам і ўсім чытачам, што вывучаюць Праграму нашай партыі. Гэтая выстаўка—пастаянная, яна будзе сістэматычна папаўняцца новай літаратурай.

Навукова-метадычны аддзел бібліятэказнаўства разам з навукова-бібліяграфічным аддзелам падрыхтавалі і распаўсюдзілі метадычныя бібліяграфічныя матэрыялы на тэму: «Прапаганда матэрыялаў і рашэнняў XXII з'езда КПСС і новай Праграмы партыі ў масавых бібліятэках рэспублікі».

Цяпер у Беларусі праходзяць семінары бібліятэчных работнікаў. Наш метадычны аддзел распрацаваў тэматыку аглядаў літаратуры і дакладаў для рэённых семінараў, на якіх будзе шырока абмяркоўвацца пытанне аб удзеле бібліятэк рэспублікі ў прапагандзе Праграмы КПСС і матэрыялаў XXII з'езда партыі. Для вывучэння вопыту работы лепшых бібліятэк і аказання дапамогі ў вобласці выязджаюць работнікі нашай бібліятэкі.

Асаблівую ўвагу звяртаем мы цяпер, працягвае тав. Санкова, на тое, што чытае наша моладзь (рабочыя, калгаснае сялянства і школьнікі).

Рыхтуецца паказальнік дзіцячай літаратуры БССР з 1917 па 1945 гады. Наша бібліятэка штомесячна выдае бюлетэнь «Новыя кнігі», у якім змяшчаюцца рэкамендацыйныя спісы літаратуры па ўсіх галінах ведаў. Цяпер у гэты бюлетэнь уключаецца і літаратура па вывучэнню матэрыялаў XXII з'езда КПСС. У кароткіх хранікальных нататках будзем расказваць, што робяць сёння бібліятэкі па прапагандзе Праграмы КПСС і рашэнняў з'езда партыі.

Бібліятэка пачала выпускаць лістоўкі «У дапамогу калгаснай і саўгаснай вытворчасці». Першы іх выпуск ўжо выйшаў у свет. Здадзен у друкарню другі выпуск, прысвечаны перадавым сельскім і калгасным бібліятэкам. У трэцім выпуску будзе абагульнены вопыт лепшых гарадскіх і раённых бібліятэк рэспублікі. Выйшаў у свет рэкамендацыйны спіс літаратуры «Нашы маякі».

Аддзел беларускай кнігі рыхтуе паказальнік «Беларуская ССР у друку Савецкага Саюза» (1946 — 61 гг.). Рыхтуюцца таксама бібліяграфічныя даведнікі пра Зм. Бядулю, Я. Коласа і Я. Купалу, і інш.

У плане нашай работы — сустрэча з работнікамі рэдакцый часопісаў «Полымя», «Маладосць», «Беларусь» і «Неман» і газеты «Літаратура і мастацтва», літаратурны вечар на тэму: «Роля беларускай савецкай мастацкай літаратуры ў выхаванні новага чалавека—будаўніка камуністычнага грамадства».

Вось ужо другі год кампазітар Ул. Алоўнікаў працуе намеснікам дырэктара Мінскага аўтазавода па эстэтычнаму выхаванню. Праўда, у штатным раскладзе такой пасады няма. Не прадугледжана і заработная плата намесніку. Але ні тое, ні другое Ул. Алоўнікаву не патрэбна. Ён прыйшоў на завод па ўласнаму пачыну і ўзяў на сябе кіраўніцтва ўсёй культурна-выхаваўчай работай на грамадскіх асновах.

Кампазітар знайшоў на заводзе спрыяльную глебу для творчага кантакту. У садружнасці з печнікам ліцейнага цэха К. Гляйхенгаузам ён стварыў лірычную песню «Дзесьці ў пасёлку», якая набыла тут шырокую папулярнасць. А цяпер Ул. Алоўнікаў стварае харэаграфічную сцэнку, якая пластычнымі сродкамі будзе апавядаць аб працы і быце заводскай моладзі. Сцэнка будзе называцца «Зубронак». На фота вы бачыце Ул. Алоўнікава сярод самадзейных танцораў аўтазавода.

Віталій ВОЛЬСКІ



ТКАЧЫ, СІВАГРАК І РАЗБІТАЯ МАШЫНА

На дрэвах і кустах каля дарогі вісяць нейкія шэрыя, круглыя, пушыстыя торбачкі. Сплеценыя памайстэрску з розных раслінных валаконцаў і сцяблінак, яны хістаюцца пры самых лёгкіх павевах ветру.

Я адразу іх пазнаў, успомніўшы малюнкі ў школьным падручніку.

Праваднік ўбачыў, што прыцягнула маю ўвагу, і кіўнуў галавою, нібы пацвярджаючы маю здагадку.

— О, месье, мабыць, ведае!... Так, так!.. Гэта ткачы!..

Свае гнёзды птушкі-ткачы падвешваюць да тонкіх і гнуткіх галінак, каб ніхто нават з самых маленькіх драпежных звяркоў не мог дабрацца да яек і птушанят. Уваход у гняздо зроблены знізу, у выглядзе трубы. Праз уваходную трубу ткач з палёту праслізгвае ў сярэдзіну гнязда.

На бліжэйшых да нас дрэвах гнёзды ткачоў віселі дзесяткамі.

— Ткачы заўсёды гняздзяцца вялікімі калоніямі, — сказаў Анры. — На адным дрэве бывае да сотні такіх гнёздаў. Ад гэтых жвавых і вясёлых птушак гінуць часам асобныя пальмы, бо ткачы, майструючы свае гнёзды, адрываюць ад лістоў пальмы вузкія даўгія палоскі, адну за другой, і пакідаюць дрэва зусім без лісця. Гнёзды ў іх вельмі трывалыя. Вісяць часам па некалькі год на адным месцы. Цяпер, у сухі перыяд, гнёзды ткачоў пустыя, а калі пачнуцца дажджы, птушкі вернуцца дахаты.

У афрыканскай саване налічваецца да пяцісот асобных відаў ткачоў, у тым ліку і вясёлыя, прыгожыя амаранты, якіх я бачыў у Абіджане. Харчуюцца яны насеннем розных раслін.

— Лятаюць ткачы разам, вялікімі чародамі, — расказвае праваднік. — Тысячы жоўтых, чырвоных, чорных і шэрых птушак з шумам, свістам і шчэбетам нападаюць на палі і плантацыі. І нічога з імі не зробіш. Людзей яны амаль зусім не баяцца. Гвінейцы не звяртаюць на іх увагі, хоць птушкі і шкодзяць им нямала.

Раптам, каля гняздоўя ткачоў, я заўважыў земляка, добра знаёмую нам сінюю птушку.

На галінцы сухой акацыі сядзеў сіваграк! Прыемная сустрэча! Ці не з берагоў Нарачы прыляцеў ён сюды?

У афрыканскім стэпе сіваграк адчувае сябе, відаць, як дома. Спакойна паглядзеў ён на разбітую аўтамашыну, якая ляжыць у баку ад дарогі.

Гэта, між іншым, ужо не першая. Па дарозе, сярод саваны, нам даволі часта трапляліся рэшткі знявечаных машын, старыя сляды аўтамабільных аварый. Гледзячы на іх, я ўспомніў тое, што расказваў нам пра маладых гвінейскіх шафёраў інжынер Мікола.

Вось і тут, пад гнёздамі ткачоў, ляжаць іржавыя рэшткі легкавой машыны. Ляжаць яны даўно, бо прараслі калючай травой.

— Чаму яны да гэтага часу не прыбраны? — пытаюся я.

— Гэта робіцца знарок, — адказаў праваднік. — Прэзідэнт Секу Турэ загадаў, каб рэшткі разбітых машын не прыбіраліся. Няхай застаюцца на месцы, як злавесны напамінак, як павучальная перасцярога для ўсіх недысцыплінаваных і нядбайных шафёраў.

— Нашага шафёра гэта, зразумела, не датычыцца, — сказаў я ўпэўнена.

— Так, яму непатрэбны такія напамінкі, — падхапіў Анры. — Вы самі бачыце, як роўна і спакойна вядзе ён машыну.

У адказ на такую рэкамендацыю задаволены шафёр шырока ўсміхнуўся і з падвоенай стараннасцю ўзяўся за руль, пільна паглядаючы наперад.

«М А Л І»

Справа, у нізіне, перад намі з'явілася невялікае азярко з люстраной паверхняй, балоцістымі берагамі і нейкімі гладкімі, круглаватымі каменнямі, якія цямнелі сярод бліскучай вады і зялёных водарасцей. На адным з каменняў стаяла маленькая белая чапля.

У густым хмызняку, які аддзяляў нас ад азярка і цягнуўся да самага гарызонта, тырчала некалькі невысокіх пальм. Гэта быў вельмі характэрны афрыканскі пейзаж.

«Якія цёмныя каменні, — падумаў я,—і як яны дзіўна падобны адзін да аднаго».

Раптам мне здалося, што бліжэйшы камень паварушыўся і нібыта крыху больш высунуўся з вады. Белая чапля, што стаяла на ім, узмахнула крыламі і пераляцела на бераг.

Анры заўважыў маё здзіўленне.

— Гэта не каменні, — усміхнуўся ён. — Гэта гіпапатамы. Яны любяць ляжаць вось так, выставіўшы спіны, у цёплай вадзе каля берагу.

— Гіпапатамы?!

Я ўскочыў з месца.

— Чаму ж мы едзем міма?.. Стойце!.. Спыніце машыну!

Але праваднік, нягледзячы на ўсю сваю ветлівасць і нязменную гатоўнасць заўсёды ісці насустрач нашым жаданням, не згадзіўся.

Машына не змяншае хуткасці, і спакойнае, соннае азярко з гіпапатамамі знікла. Яно ўжо недзе далёка за намі.

Анры ветліва просіць прабачэння.

— Даруйце, месье. Прыпынак у гэтым месцы не прадугледжаны праграмай. У нас вельмі мала часу.

Пакуль мы едзем далей па бясконцай саване, я распытваю Анры пра дзіўных жывёлін.

— Мне даводзілася бачыць гіпапатамаў дзесяткамі, калі не сотнямі разам, — расказвае праваднік. — Яны вельмі любяць ляжаць цэлымі сем'ямі ў цёплай вадзе каля берагу. Выставяць свае шырокія мокрыя спіны і грэюцца на сонцы. Некаторыя з іх павольна плаваюць і час ад часу апускаюцца зусім пад ваду, плёскаюцца, шумна пыхкаюць і фыркаюць. Тут жа, побач з самкамі, і малыя бегемоцікі. Часам увесь вадаём запоўнены тлустымі, непаваротлівымі з выгляду тушамі. З вады тырчаць толькі насы, вушы ды маленькія цікаўныя вочкі. Калі гіпапатамы пачынаюць усе разам варушыцца, вада ў невялікім азярку бурліць, хвалюецца і выходзіць з берагоў.

— А чаплі? — успомніў я. — Што робяць яны каля гіпапатамаў?

— Чаплі часта стаяць на спіне ў бегемота, калі той ляжыць, адпачываючы, у траве ці ў мелкай вадзе. Яны ловяць насякомых, якія заўсёды кружаць вакол вялізнай жывёліны. Гіпапатаму гэта падабаецца, бо птушкі пазбаўляюць яго ад надакучлівай заедзі. І чапля таксама задаволена, бо ёй каля тоўстага сябра заўсёды забяспечана лёгкая здабыча. Адначасова яна выконвае і абавязкі вартавога, папярэджваючы гіпапатама аб набліжэнні небяспекі. Калі ж гіпапатам апускаецца пад ваду, чапля ўзнімаецца ў паветра. Гэтак жа трымаюцца чаплі і каля слёноў і буйвалаў.

Я ўважліва слухаю праваднiка, стараючыся не прапусціць ні слова.

Добра, што Анры чалавек стрыманы і расказвае спакойна, павольна, а не імкліва і шпарка, як гэта робіць звычайна большасць яго суайчыннікаў.

Мне зусім не цяжка сачыць за яго яснай і дакладнай гаворкай.

— Ці праўда, што гіпапатам можа быць небяспечным для чалавека? — пытаюся я.

— Гледзячы калі, — адказвае Анры. — Наогул, да людзей у яго ніякіх спраў няма. Чалавек яго не цікавіць. Гіпапатам корміцца травой, мяса не ўжывае і на чалавека без патрэбы не нападзе. Навошта яму лішні клопат? Ён па натуры міралюбівы, флегматычны, без прычыны не крыўдзіцца. Але ўсё ж неабходна асцярога. На зямлі з ім лепш не сустракацца. Калі гіпапатам убачыць, што чалавек стаіць на яго дарозе да вады, то абурыцца на неспадзяваную перашкоду і абавязкова кінецца на вас. Старыя адзінокія самцы нападаюць часам і без усякай прычыны. Ніколі не ўгадаеш, што можа выклікаць гнеў ці нездавальненне старога гіпапатама.

— Хіба нельга ад яго ўцячы?— спытаў я. — На такіх кароткіх тоўстых ножках і з такім тлустым, адвіслым брухам ён, відаць, не можа шпарка рухацца па зямлі?

— О, не, — запярэчыў француз. — Спадзяваецца на яго камплекцыю і вагу няварта. Ён даволі спрытны, як гэта ні дзіўна, і на невялікай адлегласці можа бегчы вельмі хутка. Дагнаць чалавека яму зусім не цяжка. Лепш не станавіцца яму на дарозе, не ісці насустрач і, наогул, не лезці

(Заканчэнне на 4-й стар.).

да». Многія выказванні Багдановіча аб сутнасці і грамадскім прызначэнні літаратуры носяць ярка выяўленую палемічную накіраванасць. Менавіта ў гэтыя гады ў беларускай, як і ў рускай літаратуры знайшлі пэўнае распаўсюджанне суб'ектывісцкія тэорыі аб «свабодзе творчасці», аб «самацэннасці» мастацтва, «выключнасці» мастака. Рашуча выступаючы ў абарону прынцыпаў усвядомленага, мэтанакіраванага мастацтва, М. Багдановіч актыўна змагаўся супраць ідэалістычных канцэпцый буржуазнай эстэтыкі і арганічна набліжаўся да рэвалюцыйна-дэмакратычных пазіцый.

Так, у алегарычным апавяданні «Апокрыф» (1913) паэт раскрывае сутнасць мастацтва як выяўлення адвечных духоўных патрэб чалавека, яго імкнення да прыгожага, узвышанага і справядлівага. Сапраўдныя цаніцелямі мастацтва з'яўляюцца, па думцы аўтара, людзі, «якія ведаюць, чаго варты хлеб», г. зн. працоўныя. Іх прысуд павінен быць рашаючым у ацэнцы мастацтва. У супрацьлеглась дэкадэнцкім сцвярджэнням аб тым, што быццам бы вытокі мастацтва крыюцца «ў жаданні больш безразважнай красы, чым тая, якую нам можа даць Зямля» (К. Бальмант), Багдановіч сцвярджае, што эстэтычная краса — не вынік адвольнай суб'ектыўнай фантазіі мастака-«мага», а залежыць, як і ўсе іншыя эстэтычныя перажыванні, ад канкрэтнай грамадска-гістарычнай практыкі чалавека. Імкненне народных мас да прыгожага з'яўляецца, на думку паэта, сведчаннем творчай сілы народа, які, нягледзячы на неспрыяльныя сацыяльныя ўмовы, хоча ўнесці яго ва ўсё навакольнае жыццё. Тут Багдановіч блізка падышоў да геніяльнай думкі аб чалавеку, які «па натуры сваёй мастак» і які «ўсюды так ці інакш імкнецца ўнесці ў сваё жыццё харастко» (М. Горкі).

Гэтую ж лінію абароны народных вытокаў мастацтва М. Багдановіч нястомна працягваў і ў многіх іншых творах 1912—13 гг. («У вёсцы», «Вераніка», «Мадонна»). Шляхам супастаўлення адпаведных мастацкіх вобразаў паэт прыходзіць да вываду, што агульнай крыніцай іх з'яўляецца рэчаіснасць: тут бяруць свой творчы пачатак і славутыя рафаэлеўскія мадонны — гэтыя «недасяжныя вяршыні мастацтва» — і шматлікія цудоўныя вобразы народнай творчасці.

Пачынаючы з 1914 г., у творчых роздумах і паэтычнай практыцы М. Багдановіча ўсё большае месца займаюць пытанні збліжэння літаратуры і фальклору. У выніку гэтага значна ўдасканальваюцца ў паэта самыя метады засваення народнай стылістыкі, робяцца ўдалыя спробы спецыяльнага даследавання гэтых праблем на канкрэтным матэрыяле творчасці асобных пісьменнікаў.

Багаты творчы вопыт у галіне мастацкага фальклярызму, глыбокае вывучэнне некаторых праблем тэорыі фальклору дазволілі М. Багдановічу неўзабаве вылучыць сваю ўласную эстэтычную канцэпцыю ў спецыяльным артыкуле «Забыты шлях». Па свайму зместу і ідэйнаму пафасу артыкул гэты носіць вострапалемічны характар. У той час, як прадстаўнікі буржуазна-нацыяналістычнай літаратуры шляхам знешняй стылізацыі, выкарыстоўваючы найбольш архаічныя пласты фальклору, імкнуліся фальсіфікаваць вядучыя вызваленчыя матывы фальклору і прыстасаваць іх да сваіх рэакцыйных тэорый аб нейкай нацыянальнай «выключнасці» беларускага народа, Багдановіч адкрыта супрацьпастаўляе ім сваю рэалістычную канцэпцыю фальклярызму. У яе аснове — думка аб тым, што фальклор, як выяўленне калектыўнага мастацкага пазнання свету, павінен стаць неад'емным элементам народнасці літаратуры. Адкідаючы метад знешніх запазычанняў ці наследаванняў, вышэйшым прынцыпам мастацкага фальклярызму аўтар лічыць творчы падыход да народных паэтычных крыніц, калі пісьменнік, «не падрабляючыся пад народную песню», у адпаведнасці са сваімі індывідуальнымі схільнасцямі, творыць «у народным духу». Найбольш плённыя элементы народнага мастацтва павінны быць выкарыстаны ў адпаведнасці з актуальнымі задачамі свайго часу, творча развіты і ўзняты талентам пісьменніка на новыя ідэйна-мастацкія вышыні. Толькі такім шляхам можна ўзняцца да ўзроўню «выразніка дум, адчуванняў і настрояў нацыянальнага калектыву». Характэрна, што ў сваёй інтэрпрэтацыі мастацкага выкарыстання фальклору Багдановіч не абмяжоўваўся вузка-нацыянальнымі рамкамі, а цесна спалучаў яе з перадавымі традыцыямі іншых, у першую чаргу, славянскіх літаратур. Творчасць вялікіх нацыянальных паэтаў Пушкіна, Міцкевіча, Шаўчэнкі, на думку Багдановіча, мае непераходзячае агульначалавечае значэнне таму, што ў ёй «пад своеасаблівым чаканам крыецца паўнацэнны метал духоўнай культуры, агульнай усім цівілізаваным людзям». Вось чаму, нягледзячы на асобныя памылковыя меркаванні (фетышызацыя народнай лірычнай песні, недаацэнка творчых дасягненняў некаторых тагачасных паэтаў у галіне мастацкага фальклярызму і інш.), у цэлым пазіцыі М. Багдановіча мелі прагрэсіўны характар.

У якасці ўзораў народна-песеннага стылю да артыкула «Забыты шлях» М. Багдановіч далучае некалькі вершаў задуманага ім новага цыкла «На ціхім Дунаю» («Бясёдная», «Хоць і зорачка, ды не вячэрняя», «Як прыйшла я на ток малаціць» і інш.). Па сутнасці, гэта працяг лірычных тэм «Згукаў бацькаўшчыны».

Паглыбленне рэалізму ў творчасці М. Багдановіча на гэтым заключным этапе адбывалася не толькі пад уплывам засваення лепшых рэалістычных традыцый беларускага фальклору. Відавочна, што ў аснове складанага працэсу ляжаць фактары шырокага грамадскага і літаратурнага значэння. Вось чаму ў паэзіі Багдановіча ўсё больш прыкметныя водгукі знаходзяць актуальныя з'явы гістарычнай рэчаіснасці.

Артыкул «Забыты шлях», як і «вершы беларускага складу», не з'явіліся мяжой творчых пошукаў М. Багдановіча. Далейшая эвалюцыя яго эстэтычных поглядаў адбываецца ў напрамку няўхільнага ўзмацнення грамадзянскіх тэм і матываў. Ад пераапрацовак лірычных і бытавых песень ён пераходзіць да шырокага выкарыстання эпічных фальклорных жанраў. Вядучымі рысамі паэзіі Багдановіча становяцца высокая грамадзянская патэтыка, гераізацыя патрыятычнага подзвігу. У найбольш завершанай форме гэты працэс напаўнення фальклорных вобразаў новым ідэйна-мастацкім зместам праявіўся ў апошніх буйных творах М. Багдановіча — паэмах «Максім і Магдалена» і «Страцім-лебедзь». У аснове першай з іх — папулярны ў народнай паэзіі матыў аб няроўным каханні. Трагічная гісторыя кахання прыгоннага «хлопа» Максіма да дачкі ваяводы Магдалены пададзена ў духу старажытных народных песень і легенд: малюючы выключную сілу гэтага кахання, аўтар адначасова паказвае ўсю яго асуджанасць, безнадзейнасць і жахлівы канец. Аднак, вылучаючы на першае месца маральна-псіхалагічны канфлікт, Багдановіч паступова пераводзіць яго вырашэнне ў сацыяльны план. Так, сцэна пакарання Максіма ў фінале паэмы перарастае рамкі прыватнай з'явы і набывае шырокі сацыяльна-драматычны сэнс: жорсткая расправа адбываецца на вачах народа і служыць своеасаблівым «нямым» заклікам да помсты.

Аднак узмацненне вызваленчага руху народных мас у апошніх перадрэвалюцыйных гады настойліва патрабавала не толькі новых, больш акрэсленых форм сацыяльнага пратэсту, але і рашучага рэвалюцыйнага дзеяння. Відавочна, адчуваючы некаторую абмежаванасць у адлюстраванні характэрных працэсаў эпохі — амаль ва ўсіх папярэдніх творах пісьменніка яны трактуюцца пераважна ў звужаным эмацыянальна-псіхалагічным плане—Багдановіч імкнецца стварыць новы, адпавядаючы перадавым грамадскім ідэалам вобраз змагара за народную справу. Як вядома, праблема гераічнага характару ўзнікла перад паэтам не ўпершыню («Мая душа», «Рушымся, браця, хутчэй», «Разгарайся хутчэй, мой агонь, між імглы» і інш.), аднак найбольш поўнае вырашэнне яна знайшла ў паэме «Страцім-лебедзь». Асноўнай філасофскай канцэпцыяй твора з'яўляецца сцвярджэнне дзейсных адносін да жыцця, адмаўленне нявольніцкай псіхалогіі прыстасавальніцтва і індывідуалістычнай маралі наогул.

Паэма «Страцім-лебедзь»—падагульняючы вынік працяглых фальклярыстычных пошукаў М. Багдановіча, сведчанне няўхільнага паглыблення рэалістычных прынцыпаў ва ўсёй творчасці паэта. Як вядома, у аснову паэмы лёг адзін з варыянтаў народнай казкі пра непакорную «Страцім-пціцу», якая, ратуючы іншых «дробных птахаў», загінула ў час міфічнага «патопу». У паэтычнай інтэрпрэтацыі М. Багдановіча гэты апакрыфічны твор арыгінальна прыстасаваны да новых творчых задач. Перш за ўсё, значна ўзмоцнены «богаборчыя» матывы народнага сказа — бунт Страцім-лебедзя падаецца тут не як выпадковая праява «буйства», непаслухмянасці, а як глыбока ўсвядомлены гераічны подзвіг у імя агульных інтарэсаў. Сэнс такой пераапрацоўкі відавочны: наблізіць ідэйны змест твора да адлюстравання характэрных з'яў бурлівай перадрэвалюцыйнай рэчаіснасці. Іменна ў гэтыя гады прадстаўнікі беларускай буржуазна-нацыяналістычнай інтэлігенцыі, перапалоханыя рэальнай пагрозай рэвалюцыйнага ўзрыву мас, вылучаюць тэорыю «малых спраў», «культурнай працы» і інш. Натуральна, што гэтыя рэакцыйныя тэорыі выклікалі рашучы пратэст з боку перадавых беларускіх пісьменнікаў на чале з Я. Купалам і Я. Коласам — гэта пярэчыла іх патрыятычным ідэям барацьбы «за волю вольнай грамадзе». У паэме «Страцім-лебедзь» выразна адчуваецца страсная палеміка аўтара з буржуазнай тэорыяй пазітывізму. І хаця з прычыны яснепаласці светапогляду паэту яшчэ былі няясны рэвалюцыйныя перспектывы недалёкай будучыні, аднак ён адразу становіцца на бок рэвалюцыйнай дэмакратыі, інстынктыўна адчуваючы, што адзіным шляхам да вызвалення з'яўляецца барацьба народа.

Такім чынам, развіццё эстэтычных поглядаў М. Багдановіча на заключным этапе ішло не толькі ў напрамку арганічнага засваення народна-паэтычнай стылістыкі, але і ў напрамку паглыбленага рэалістычнага адлюстравання характэрных грамадскіх з'яў і працэсаў. І ў гэтым настойлівым імкненні наблізіць сваю творчасць да жыватворных крыніц народнага жыцця—прагрэсіўная сутнасць шматгадовых ідэйна-эстэтычных пошукаў выдатнага беларускага паэта.

Працяг. Пачатак у нумары за 1 снежня г. г.

НЕ БЫЦЬ ВАЙНЕ!

У мінулым месяцы па ініцыятыве пісьменнікаў Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі ў Берліне адбылася сустрэча пісьменнікаў сацыялістычных краін, якія мяжуюць з Германіяй. У сустрэчы прынялі ўдзел пісьменнікі Чэхаславакіі, Польшчы, Германіі — Іржы Марэк, Петэр Корваш, Здэнек Плугарж, Ежы Путрамент, Антоні Ольха, Анна Зегерс, Арнольд Цвейг, Людвіг Рэн, Эрвін Штрытматэр, Стэфан Хермлін. Гасцямі былі пісьменнікі Савецкага Саюза Барыс Палявы і Алесь Ганчар.

Пісьменнікі азнаёміліся са становішчам, што склалася ў Берліне ў сувязі з правакацыямі заходнегерманскіх рэваншыстаў, гутарылі з салдатамі пагранічнай аховы і байцамі народных дружын. Яны расказалі аб правакацыях амерыканскай і англійскай ваеншчыны. Пісьменнікі прынялі Зварот да ўсіх пісьменнікаў свету, у якім заклікаюць пазбавіцца ад рэшткаў другой сусветнай вайны. У Звароце гаворыцца, што Германія, якая знаходзіцца ў сэрцы Еўропы, расколатая, і існуюць дзве германскія дзяржавы. У яе заходняй частцы, Федэратыўнай Рэспубліцы Германіі, тыя ж грамадскія групы, якія развязалі першую і другую сусветныя войны, рыхтуюць новую знішчальную вайну. Аднак усходняя частка Германіі, Германская Дэмакратычная Рэспубліка, далучылася да саюза сацыялістычных дзяржаў і іншых краін, якія імкнуцца да міру. Удзельнікі сустрэчы заявілі: «Мірны дагавор павінен ліквідаваць усе рэшткі другой сусветнай вайны, стрымаць заходнегерманскіх мілітарыстаў і рэваншыстаў і гэтым самым садзейнічаць забеспячэнню міру ва ўсім свеце. Той, хто выступае супраць яго, дапамагае тым, якія не ўяўляюць жыцця без вайны».

Зварот атрымаў шырокі водгук у пісьменнікаў. Да Звароту далучыліся пісьменнікі К. Федзін, А. Твардоўскі, М. Шолахаў, А. Карнійчук, М. Маерава, Я. Дрда, Я. Івашкевіч, Л. Кручкоўскі і многія іншыя.

У адрас Саюза пісьменнікаў Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі кожны дзень прыходзяць новыя тэлеграмы, у якіх пісьменнікі горача падтрымліваюць Зварот.

Сваё слова ў абарону міру сказалі і літаратары Савецкай Беларусі. Кандрат Крапіва паслаў тэлеграму ў Берлін на імя вядомай нямецкай пісьменніцы Анны Зегерс. Ён піша: «Горача падтрымліваю Зварот да пісьменнікаў свету, далучаю свой голас да голасу ўсіх сумленных людзей, якія змагаюцца за мір на зямлі і шчасце для ўсяго чалавецтва. Рэшткі другой сусветнай вайны павінны знікнуць, мір павінен быць заключаны».

У сваёй тэлеграме Макар Паслядовіч піша аб тым, што натуральнаму праву чалавека — жыць і працаваць у міры, радавацца шчасліваму голасу дзяцей — зноў пагражаюць недабітыя мілітарысты і рэваншысты Захаду. Але яшчэ свежыя ў нашай памяці крывавыя карціны фашысцкіх лагераў смерці, і таму ўсе працоўныя свету не могуць спакойна назіраць, як у ФРГ рыхтуюцца новыя шыбеніцы, душагубкі, як трэніруюць аўчарак для палявання на людзей. «Горача далучаюся да Звароту,—гаворыць у тэлеграме М. Паслядовіч. — Гэта не толькі мой голас, а галасы ўсяго майго беларускага народа».

У сваіх тэлеграмах Максім Танк і Алесь Якімовіч гавораць пра шчасце жыць і працаваць у імя светлага будучага чалавецтва, у імя міру і дружбы паміж усімі народамі. Пісьменнікі адзначаюць, што будучыні зноў пагражаюць недабітыя фашысцкія каты і іх апекуны. Падтрымліваючы Зварот, беларускія пісьменнікі вераць, што народы свету будуць пазбаўлены ад пагрозы знішчэння жыцця на зямлі.

Чытачы абмяркоўваюць часопіс «Неман»

Адбылася сустрэча чытачоў з работнікамі і аўтарскім актывам часопіса «Неман», наладжаная масавай бібліятэкай № 1 Кастрычніцкага раёна г. Мінска.

Аб творчых планах часопіса на 1962 год расказаў сакратар рэдакцыі Г. Папоў.

Чытачы «Немана»—рабочы камвольнага камбіната т. Пераход, эканаміст т. Рудзінскі, пенсіянер т. Цімафееў, юрыст т. Рутман, загадчыца чытальнай залы т. Бандарэнка і інш. станоўча адзначылі надрукаваныя ў часопісе аповесць А. Браілоўскага «Дзень чалавека», нарысы А. Зарыцкага і П. Валкадаева «Рэгіна Златнік» і «Зялёныя квадраты», вершы Н. Кісліка і іншыя творы.

У адрас рэдакцыі часопіса быў зроблен рад крытычных заўваг. Выступаўшыя крытыкавалі ў прыватнасці аповесць Д. Уксусава «Я — твой сябра».

Чытачы выказвалі пажаданне, каб часопіс больш ярка і разнастайна афармляўся, каб у ім друкаваліся добрыя нарысы аб жыцці рабочага класа, калгаснага сялянства.

На пытанні чытачоў адказаў галоўны рэдактар часопіса Я. Васілёнак.

На сустрэчы выступілі з чытаннем сваіх твораў А. Бялевіч, Н. Кіслік, П. Прыходзька, В. Тарас.

УСІМ РАЁНАМ— У ТЭАТР

Вясёлыя, святочна апранутыя юнакі і дзяўчаты днямі запоўнілі памяшканне Брэсцкага абласнога тэатра імя Ленінскага камсамола. Гэта былі не звычайныя наведвальнікі тэатра, не жыхары Брэста і яго ўскраін.

На гэты раз сюды сабралася моладзь з усяго Брэсцкага раёна, — маладыя паляводы, жывёлаводы, механізатары, сельская інтэлігенцыя.

Весела і культурна правялі гэты вечар працаўнікі вёскі. Яны прагледзелі спектакль «І праўда і шчасце», патанцавалі ў прасторным фае тэатра.

І. МЕЛЬНІЧУК.

ХТО ЛЕПШ, ХТО ЦІКАВЕЙ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

узнімаюць сваю гаспадарку і забяспечваюць сабе дастатак у доме. З вялікай прывабнасцю і майстэрствам вядзе ролю Тараса К. Катлінскі. Запамінальны вобраз безгаспадарлівага загадчыка фермы калгаса «Рассвет» Залівайкі стварыў М. Кавалеўскі. Сапраўдную вастрыню агляду ствараюць сатырычныя прыпеўкі на мясцовыя тэмы, музычна-гумарыстычныя куплеты «Хіма, не хадзі міма», прыпеўкі «Два калгасы стаяць побач» і інш.

Кожная мастацкая агітбрыгада па свойму арыгінальная і цікавая. Так, выступленне Лёзненскай брыгады (кіраўнік Я. Траяноўскі) мае характар надзённага яркага плаката, вельмі кідкага па змесце.

На вялікім уздыме, з сапраўдным пафасам вядуць праграму Бондарава і Траяноўскі (ён жа аўтар патрыятычных вершаў і тэкстаў да песень). Уступная песня пра выдатныя савецкія будні, частушкі аб камунізме, вершы, прысвечаныя перадавым людзям калгаснай вёскі: 80-гадоваму І. Шашкову і Герою Сацыялістычнай Працы М. Ігнатавай — праз усе гэтыя нумары праходзіць адна вялікая думка, што зара камуністычнага Заўтра, запаленая рукамі савецкіх людзей, разгараецца ўсё ярчэй і мацней над светам. З вялікім майстэрствам былі выкананы вакальны дуэт «Ручнікі» самадзейнага кампазітара Пятрэнкі (выканаўцы В. Альхоўская і Т. Дзяткова), многія жартоўныя і сатырычныя сцэнкі, асабліва вельмі дасціпная «Карцінная галерэя», якая бічуе гультаёў, хуліганаў, п'яніц, што сустракаюцца на нашым шляху.

А вось брыгада Віцебскага раённага Дома культуры мае зусім іншае творчае аблічча: у яе выступленні амаль адсутнічае плакатнасць, але затое ёсць спроба ў жывой тэатралізаванай форме раскрыць многія падзеі і з'явы калгаснага жыцця раёна. Яркімі і выразнымі атрымаліся сцэнкі аб тым, як «адкормліваюць» свінней у калгасе «Шлях Леніна», пра слабыя надоі малака ў калгасе «Прагрэс» і інш. У іх нямала вострых сатырычных знаходак і тонка заўважаных рыс з народнага жыцця. Для таго, каб некаторыя вакальныя і танцавальныя нумары не выглядалі ўстаўнымі і выпадковымі, віцябляне ўмела выкарысталі ў аглядзе форму ўмоўнага радыёэпартажу, які нібы вядзецца са свята ў калгасе «Чырвоная Армія» пасля ўручэння яго калектыву пераходнага Чырвонага сцяга за вытворчыя поспехі. Віцебская агітбрыгада, апроч уласнага тэкставага матэрыялу, парадавала двума харавымі творамі — «Маршам ударнікаў камуністычнай працы» і «Песняй аб Віцебску», якія напісаў мастацкі кіраўнік В. Смірноў.

У глядзельнай зале ў час выступлення рэчыцкіх артыстаў.

Добра сябе паказалі на аглядзе агітбрыгады Баранавіцкага, Лунінецкага, Ашмянскага дамоў культуры і некаторыя сельскія брыгады, у прыватнасці, Варапаеўская з Віцебшчыны і Сеўрукоўская з Гомельшчыны. У іх выступленнях нямала выдумкі, творчай фантазіі і мастацкіх знаходак.

Агляд працягваецца. Усё новыя самадзейныя калектывы ўключаюцца ў гэта цікавае творчае спаборніцтва. А хто з яго выйдзе пераможцам — па-ранейшаму пакуль невядома.

Г. СІЦЯК.

Такая «Карцінная галерэя» лёзненцаў—моцны ўдар па гультаях, п'яніцах і хуліганах.

На музычным фестывалі ў Берліне

Па запрашэнню Саюза кампазітараў Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі восенню гэтага года я прысутнічаў на Берлінскім музычным фестывалі, які па традыцыі праводзіцца ў гэтай краіне штогод. На гэтым фестывалі ў якасці гасцей прысутнічалі дзеячы музычнай культуры многіх сацыялістычных краін: з Балгарыі— кампазітар і скрыпач Хрыстоскаў, маладыя кампазітары Хрыстоў і Лісічкова, музыказнаўца Ангелаў; з Чэхаславакіі — вядомы музыказнаўца Сіхра; з Венгрыі — кампазітар, прафесар Будапешцкай кансерваторыі Мараш і іншыя.

Праграма музычнага фестывалю была шырокая і разнастайная. Яна ўключала ў сябе творы класічнай музыкі, сучасных нямецкіх кампазітараў розных стыляў і напрамкаў, кампазітараў многіх еўрапейскіх краін, а таксама лепшыя ўзоры савецкай музыкі.

Фестываль, які працягваўся больш двух тыдняў, адкрыўся выкананнем Дзевятай сімфоніі Бетховена (дырыжор Франц Канвічны). Мне ўдалося паслухаць канцэрт лейпцыгскага хору Тамаркірхе, ігру выдатнага пражскага інструментальнага нанэта, аркестра Камічнай оперы, які пад кіраўніцтвам К. Мазура выканаў сімфонію Э. Мэера і Канцэрт для альта з аркестрам Бела Бартока. Асабліва спадабаўся Канцэрт для альта, прасякнуты інтанацыямі венгерскай народнай музыкі. Таленавітым інтэрпрэтатарам гэтага арыгінальнага інструментальнага твора венгерскага кампазітара з'явілася французская альтыстка Давія Біндэр.

Высокамастацкім музычным калектывам паказаў сябе аркестр Камічнай оперы і пры выкананні Трэцяй сімфоніі Брамса, дзе кампазітар прадстае перад слухачамі як пяшчотны, летуценны рамантык.

У дні фестывалю я прысутнічаў на праглядзе некалькіх оперных твораў. На сцэне Берлінскага опернага тэатра з поспехам зараз ідзе лірыка-камічная опера Рыхарда Штрауса «Кавалер руж».

Калі опера «Кавалер руж» зрабіла на мяне вельмі добрае ўражанне, дык другая опера «Сон у летнюю ноч» (па Шэкспіру) сучаснага англійскага кампазітара Бенджамена Брытэна выклікала нездавальненне. У ёй пераважае ў асноўным ілюстрацыйная музыка, адсутнічае канкрэтны меладычны матэрыял, без якога оперны твор не можа наогул існаваць. Паколькі тэматычны матэрыял у оперы «Сон у летнюю ноч» не развіваецца, таму не можа быць і гаворкі пра нейкую музычную драматургію. Хочацца заўважыць таксама, што нават выдатная пастаноўка гэтага твора англійскага кампазітара калектывам Берлінскай камічнай оперы не выратоўвае яго ад няўдачы.

Знаёмячыся з рознымі сімфанічнымі і камернымі творамі ў жывым гучанні на адкрытых канцэртах, удзельнікі фестывалю мелі таксама доступ да музыкі ў магнітафонным запісе, галоўным чынам, сучасных кампазітараў. Мне давялося пачуць у запісе Чацвёртую сімфонію для струннага аркестра Чыленсека, фартэпіянны канцэрт Г. Кохана, меладраму «Ліло Герман» (для хору, чытальніка і аркестра) П. Дэсау і інш.

У той час, як Чацвёртая сімфонія Чыленсека і фартэпіянны канцэрт Г. Кохана прывабліваюць меладычнай свежасцю, шчырасцю і канкрэтным музычна-тэматычным матэрыялам, дык творы Штокгаўзена адштурхоўваюць адсутнасцю ў іх усякай мелодыі і яснай гармоніі. Штокгаўзен — адзін з лідэраў заходне-еўрапейскага дадэкафанізму, дзе сама музыка знікае і застаецца адзін сумбур.

Будучы ўдзельнікам фестывалю, я меў магчымасць пазнаёміцца з музычным жыццём не толькі Берліна, але і Лейпцыга, Веймара, Эйзенаха, Эрфурта і іншых гарадоў. У Лейпцыгу я слухаў прэм'еру оперы С. Пракоф'ева «Вайна і мір», якую паставіў з вялікім густам і веданнем эпохі мясцовы оперны тэатр. У спектаклі выдатна гучаць хор і аркестр, высокім майстэрствам здзіўляюць салісты гэтага тэатра.

Лейпцыг—старажытны горад. Ён славіцца багатымі музычнымі традыцыямі. У гэтым горадзе была пабудавана першая ў Германіі кансерваторыя, адкрыта зала для сімфанічных канцэртаў, якая захавалася да нашых дзён.

У гэтым старажытным нямецкім горадзе я пазнаёміўся з вядомым кампазітарам О. Герстэрам, вельмі гасцінным і чулым чалавекам. О. Герстэр паказаў у грамзапісе сваю «Дрэздэнскую сюіту», Канцэрт для віяланчэлі з аркестрам, «Урачыстую уверцюру». Музыка гэтага кампазітара вызначаецца шчырасцю і яснай зразумелай музычнай мовай. Глыбокая сувязь з класічнымі традыцыямі не перашкаджае О. Герстэру знаходзіць новыя сродкі музычнай выразнасці.

І якімі ж неабгрунтаванымі з'яўляюцца выказванні нямецкіх кампазітараў мадэрнісцкага напрамку пра тое, што быццам бы нямецкі народна-песенны фальклор вычарпаны і да яго не варта больш звяртацца. У гэтым яны вельмі памыляюцца. Бо якраз кампазітары рэалістычнага напрамку Чыленсек і Герстэр, якія прытрымліваюцца класічнай спадчыны, умела выкарыстоўваюць фальклор пры стварэнні сваіх твораў, і яны народу падабаюцца.

Вялікае ўражанне засталося ў мяне ад знаёмства ў Лейпцыгу з архівам І. С. Баха. Дырэктар архіва прафесар В. Нойман паказаў сабраныя супрацоўнікамі архіва шматлікія рукапісы твораў вялікага кампазітара. Тут мне ўдалося ўдакладніць некаторыя факты пра асобныя, раней невядомыя шырокай грамадскасці, творы Баха і даведацца аб тым, што зараз павінна выйсці з друку поўнае выданне яго твораў.

Я сустракаўся са старшынёй Саюза кампазітараў ГДР прафесарам Натовіцам, з дырэктарам Берлінскай кансерваторыі прафесарам-піяністам Рэблінгам і Веймарскай кансерваторыі — прафесарам Феліксам.

Я расказваў нямецкім сябрам аб савецкай, у тым ліку беларускай музыцы, аб тым, як у нашай краіне вядзецца планамерная падрыхтоўка новых спецыялістаў у галіне музычнага мастацтва. У час маёй размовы з дырэктарам Берлінскай кансерваторыі Рэблінгам былі выказаны пажаданні, каб наладзіць абмен брыгадамі студэнтаў і педагогаў абедзвюх кансерваторый з мэтай падзяліцца вопытам навучальна-выхаваўчай работы.

Берлінскі музычны фестываль садзейнічаў узмацненню культурнай сувязі паміж народамі. Неабходна і ў далейшым яшчэ больш паляпшаць кантакты паміж кампазітарамі Савецкага Саюза і Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі шляхам больш частых творчых паездак адзін да аднаго.

А. БАГАТЫРОЎ,
заслужаны дзеяч мастацтва БССР, рэктар Беларускай кансерваторыі.

На кінастудыі «Масфільм» ідуць здымкі другой серыі фільма «Уваскрэсенне» па аднайменнаму раману Л. Н. Талстога. Рэжысёр-пастаноўшчык—М. А. Швейцар. Аператар—С. С. Палуянаў.
Вы бачыце, як М. А. Швейцар (справа) рэпеціруе сцэну з артысткай Тамарай Сёмінай (Кацюша Маслава) і артыстам Яўгеніем Мацвеевым (Ніяхлюдаў).

Фота А. КАНЬКОВА. (ТАСС)

У ГВІНЕІ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.).

яму на вочы. Сківіцы ў гіпапатама такія вялікія і моцныя, што ён можа перакусіць і разламаць на кавалкі рыбацкую лодку. Калі ж вы ціха стаіце на беразе, гіпапатам ніколі не вылезе з вады, каб на вас напасці. Ён толькі будзе сачыць за вамі цікаўна і насцярожана.

— А як называюць гіпапатама афрыканцы?

— Малі, — адказаў праваднік.

Гэта было нечакана.

— Малі? — перапытаў я.

— Так, месье, малі, — пацвердзіў Анры. — Эмблемай вядомай вам дзяржавы Малі з'яўляецца гіпапатам. Той жа корань ляжыць і ў аснове назвы народа малінке, які стварыў некалькі стагоддзяў назад «імперыю» Малі, вялікую па сваёй тэрыторыі. Калісьці гіпапатамаў было вельмі многа ва ўсёй Заходняй Афрыцы.

ПАЛЯВАННЕ НА ГІПАПАТАМА

Машына ішла на ўсход. Абапал дарогі цягнуўся ўсё той жа аднастайны пейзаж травяной саваны. Куды ні глянь, усюды жоўтая трава і голыя калючыя кусты, усюды бязмежны прастор, спакой і цішыня.

Толькі наперадзе злева з'явілася на гарызонце сіняватая сцяна далёкіх гор.

Мы ўсё яшчэ гаворым пра бегемотаў. Праваднік гэтая тэма цікавіць, відавочна, не менш, як нас.

— Гіпапатам у перакладзе з грэчаскай мовы значыць, як вы і самі ведаеце, — «рачны конь», — паведамляе Анры.

Пры гэтым ён смяецца, весела паглядаючы на нас.

— Сан дут! Без сумнення! Нішто сабе конік, э?.. Вагою тоны ў дзве, калі не болей! Зразумела, што з коньмі ён не мае нічога агульнага, бо належыць да сямейства свінней. Не ведаю, чаму такія разумныя людзі, як старажытныя грэкі, гэтак памыляліся, назваўшы свінню канём? І чаму мы, не менш разумныя, паўтараем гэтую памылку следам за грэкамі? Лепш было б назваць яго «рачною свіннёю». Па справядлівасці! Ці не праўда, месье? І мяса ў яго падобнае на свініну, можа нават і смачнейшае. Гэта я сам магу засведчыць.

— У Гвінеі палююць на гіпапатама? — звярнуўся я да правадніка.

— Раней палявалі, — адказаў Анры. — Палявалі дзеля мяса і іклаў, якія карыстаюцца попытам не менш за слановыя біўні. Але паляванне афрыканцаў з дзідамі і гарпунамі было вельмі цяжкім, небяспечным і не заўсёды паспяховым.

— А вам, месье Анры, не даводзілася паляваць на гіпапатама?

— О, месье, не адзін раз!

Я папрасіў яго расказаць, як гэта робіцца.

Твар правадніка адразу спахмурнеў.

— Нічога цікавага, месье. Звычайная бойня. Можа, лепш я з вамі падзялюся сваімі першымі ўражаннямі, найбольш раннімі і таму найбольш яркімі?

— Калі ласка!.. Гэта яшчэ цікавей.

Анры ажывіўся. Крыху падумаўшы, ён пачаў:

— Мне давялося быць сведкам палявання мясцовых людзей на гіпапатама неўзабаве пасля таго, як я прыехаў у Гвінею. У Афрыцы я быў тады яшчэ зусім навічком. Гэта было даўно, але я помню ўсе дробязі так, нібы гэта адбылося ўчора. У той час яшчэ не было такіх суровых абмежаванняў, і жыхары невялікай вёскі, дзе я знаходзіўся, палявалі на гіпапатамаў, хоць і не вельмі часта. Справа гэтая была для іх вельмі нялёгкая. Трэба сказаць, што яны нямала цярпелі ад бегемотаў, бо тыя часам выходзілі ноччу на вясковыя плантацыі недалёка ад возера. Кожнае такое здарэнне было для вёскі сапраўдным няшчасцем. Адно сямейства бегемотаў магло знішчыць за адну ноч даволі вялікае поле.

Гіпапатам хоць і жыве ў вадзе, а корміцца на зямлі. На беразе, каля вады, ён есць траву, лісце, карэнне вадзяных раслін, а на палях і плантацыях — усё, што знойдзе. І рыс, і кукурузу, і дыні, і памідоры.

На паляванне, пасля адпаведных цырымоній, выйшла пад гукі тамтама некалькі дзесяткаў чалавек. Усе яны былі голыя, узброеныя вялікімі дзідамі. Гіпапатама падпільнавалі на пратаптанай звярамі сцежцы сярод высокага трысця, калі ён выйшаў на бераг пасвіцца і адышоў на некаторую адлегласць ад возера.

Паляўнічыя падбеглі да гіпапатама адначасова з усіх бакоў, адрэзаўшы яму шлях да вады, і пачалі кідаць у яго дзіды і гарпуны з прымацаванымі да іх трывалымі вяроўкамі.

Раз'юшаная, разгубленая раптоўным нападам жывёліна шалёна кідалася ва ўсе бакі, цяжка пыхкаючы і сапучы, раззявіўшы пачварную пашчу з жоўтымі, крывымі і няроўнымі іклами, але паляўнічыя спрытна ўхіляліся, хаваючыся ў трысці.

Дзіды, кінутыя з усёй сілы, тырчалі ў тоўстай скуры звера, перашкаджаючы яму рухацца. У выпадку небяспекі гіпапатам заўсёды шукае ратунку ў вадзе. У параненага звера была цяпер толькі адна мэта — як мага хутчэй дабрацца да вады. Нарэшце, яму гэта ўдалося. Ён прарваўся скрозь акружэнне, з неверагоднай шпаркасцю і вялікім шумам дабег, ламаючы кусты і падмінаючы трысцё, да берагу і з размаху плюхнуўся ў возера. Ад яго цяжкага цела ўзняліся хвалі.

Калі гіпапатам апусціўся пад ваду, паплаўкі з пучкамі раслін, прымацаваныя на канцы кожнага каната, засталіся на паверхні і паказвалі, дзе ён знаходзіцца. Некаторыя з паляўнічых селі ў лодкі.

Новыя дзіды паляцелі ў бегемота, калі ён высунуў з вады галаву, каб набраць у лёгкія паветра.

Гіпапатам глуха і цяжка павярнуўся ў вадзе. Раптам адна з лодак узнялася ў паветра і перакулілася. Гэта гіпапатам ударыў лодку знізу, з-пад вады, сваёй вялікай галавой і шырокай спіной, падкінуўшы яе ўверх.

Людзі апынуліся ў вадзе і паплылі хутчэй да берагу, каб не трапіць на зуб кракадзілам, якіх у возеры было нямала. Што датычыцца гіпапатамаў, то яны кракадзілаў не баяцца. Кракадзілы іх ніколі не чапаюць, нават малых.

Астатнія паляўнічыя на лодках не пакідалі гіпапатама ў спакоі. Звер тым часам знясілеў. Усё часцей выстаўляў ён галаву з вады, і тады зноў ляцелі ў яго вострыя і цяжкія дзіды. Вада пачырванела ад крыві.

Барацьба з гіпапатамам цягнулася ледзь не сутки. Толькі на другі дзень жывёліну выцягнулі на бераг. У гэтым удзельнічала амаль усё насельніцтва вёскі. Дзесяткі чорных рук трымаліся за канаты. Пасля доўгіх намаганняў людзі вывалаклі з вады цёмную, нязграбную тушу. Яна ўся была ўтыкана дзідамі і гарпунамі, аблытана вяроўкамі.

Забітага бегемота тут жа асвежавалі і пачалі дзяліць. Для жыхароў вёскі гэта была вялікая радасць. Ім дасталося каля дзвюх тон свежага мяса, якое так цэніцца ў Афрыцы.

Канец палявання быў адзначан вялікім святам з песнямі і танцамі. Цэлы дзень жыхары вёскі і іх бліжэйшыя суседзі елі мяса і гулялі. І як тут не весяліцца, калі ўсе сытыя, а на паляванні ніхто не загінуў? Так палявалі на бегемота афрыканцы ў старыя часы.

Калі з'явіліся еўрапейцы з удасканаленымі стрэльбамі, колькасць гіпапатамаў у краіне адразу зменшылася. Цяпер паляванне на іх забаронена. Забіць гіпапатама можна толькі за вялікую плату, па спецыяльнаму дазволу, выдача якіх строга абмежавана. Між іншым, драпежніцкае знішчэнне бегемотаў выклікала ў нашых рэках і азёрах рэзкае змяншэнне колькасці рыб.

— Чаму? — здзівіўся адзін з нашых пасажыраў. — Якая ж тут сувязь?

— Самая непасрэдная, — адказаў Анры. — Адкідамі гіпапатамаў жывіцца планктон, якім у сваю чаргу кормяцца рыбы. Чым менш у рацэ гіпапатамаў, тым менш у вадзе планктону. Значыць, менш і рыбы, якой не хапае корму. І наадварот. Як бачыце, месье, усё вельмі проста і заканамерна. Вось чаму ўсе мы зацікаўлены ў тым, каб у Гвінеі тоўстаскурыя «малі» не звяліся, каб іх у нашых рэках і азёрах было больш. Вось чаму ахоўваем мы гіпапатамаў.

—А здараюцца выпадкі самавольнага, незаконнага палявання?

— На жаль, бываюць. І цяпер яшчэ гіпапатамы часам гінуць ад рукі браканьераў. Для афрыканцаў паляванне на бегемотаў і сланоў было жыццёвай неабходнасцю, нялёгкай і небяспечнай працай, якая не магла парушыць раўнавагу ў прыродзе, а для белых— забавай ці сродкам драпежніцкага ўзбагачэння. Такім чынам, паміж паляваннем афрыканцаў і паляваннем белых — вялікая розніца.

Такой тырадай наш праваднік закончыў свой расказ.

Я паглядзеў на яго з цікавасцю.

— Вы кожнаму падарожніку з Еўропы ці Амерыкі выказваеце такія думкі?

— О, што вы, месье! Я ведаю, каму і што гаварыць. Суайе сюр! Будзьце ўпэўнены! Тое, што я кажу вам, я ніколі не скажу турысту, які прыехаў у Афрыку толькі для таго, каб забіваць, бо купіў сабе права на гэта за вялікія грошы. Гаварыць ім пра гэтыя рэчы бескарысна. Такія людзі не любяць праўду і ні аб чым не хочуць ведаць, акрамя сваёй пацехі і задавальнення. Такі чалавек можа яшчэ пакрыўдзіцца. Ён палічыць, што яго дрэнна абслугоўвалі і тады я буду мець непрыемнасці. О, месье, я ўсё разумею!

Уважліва слухаў я маляўнічую гаворку Анры. Эпізоды палявання афрыканцаў на гіпапатама стаялі перад маімі вачыма.

Некалькі хвілін мы сядзелі моўчкі. Анры, відаць, быў яшчэ ўвесь пад уражаннем успамінаў.

— Шкада, месье, што праграма нашага падарожжа абмежаваная,—дадаў ён, схамянуўшыся. — Я ведаю мясціны, дзе бегемоты збіраюцца на водмелях. Там можна было б зрабіць цікавыя здымкі. Але, на жаль, гэта не прадугледжана праграмай, а я магу рабіць толькі тое, што мне загадана адміністрацыяй.

Ці варта казаць, што я шкадаваў аб гэтым яшчэ больш.

Мне вельмі хацелася ўбачыць гіпапатама ў натуральных умовах з блізкай адлегласці, але гэтае жаданне засталося пакуль што не здзейсненым.

КРАКАДЗІЛ «РЭАБІЛІТАВАНЫ»

Ажыўленая гаворка ў машыне ні на хвіліну не спынялася.

З бегемота ўвага падарожнікаў непрыкметна пераключылася на іншых звяроў афрыканскай саваны і трапічнага лесу.

Анры ўвесь час добрасумленна стараўся, каб ніхто з яго кліентаў не сумаваў.

— У тым азярку, ля якога вы хацелі спыніцца,—сказаў ён,—жывуць і маленькія балотныя кракадзілы. А ў навакольнай саване сустракаюцца дзікія буйвалы і антылопы.

З далейшай размовы высветлілася, што дзікіх звяроў—і антылоп, і буйвалаў у саване, і кракадзілаў у балотах і азёрах тут цяпер значна менш, чым было калісьці. Іх бязлітасна павыбівалі па ўсёй Афрыцы багатыя паляўнічыя, якія прыязджалі сюды з усіх канцоў свету, каб забіваць без меры і патрэбы. Забіваць дзеля забавы, каб потым можна было пахваліцца за бутэлькай віна, у коле сваіх сяброў, такіх жа абібокаў, шматлікімі трафеямі — шкурамі і рагамі рэдкіх жывёл, застрэленых уласнай рукой.

Шкуры ільва, леапарда і зебры, рогі буйвала і розных антылоп, біўні слана, іклы бегемота карыстаюцца ў гэтым асяроддзі найбольшай папулярнасцю, як рэчавыя доказы «мужнасці» і паляўнічай «адвагі».

Для багатых і знатных аматараў палявання на экзатычных звяроў арганізоўваліся спецыяльныя экспедыцыі, так званыя «сафары». Вандруючы па саване, багаты турыст карыстаўся ўсім прывычным камфортам сучаснага цывілізаванага жыцця. Ездзіў ён у легкавой машыне, а ўсе патрэбныя рэчы, прадукты і віны везлі за ім на грузавіках. Спаў ён у прасторнай палатцы, на чыстым ложку, пад сеткай, якая абараняе ад маскітаў, мыўся ў ванне з цёплай вадой, еў і піў за сталом, гушкаўся ў гамаку, карыстаўся перасоўным туалетам. Повар гатаваў яму дэлікатэсныя стравы, слуга нёс за ім стрэльбу.

Вопытныя прафесіяналы, паляўнічыя-следапыты, знаходзілі для яго рэдкіх звяроў і дапамагалі іх забіць ва ўмовах поўнай бяспекі. Праваднікі, накшталт нашага Анры, адказвалі за жыццё такога турыста і за тое, каб ён быў задаволены, перад фірмай, якая арганізоўвала раскошную экспедыцыю.

У некаторых калоніях такія «паляванні» арганізуюцца часам на самай граніцы вялікіх запаведнікаў, створаных амаль па ўсёй Афрыцы.

Фармальна ўсё як быццам правільна, бо знатныя «паляўнічыя» забаўляюцца не на тэрыторыі, якая знаходзіцца пад аховай закона. Але па сутнасці гэта не паляванне, а бойня, як гаворыць Анры, бо звяры, якія выходзяць за межы запаведніка, дзе ім ніхто не пагражае, вельмі даверлівыя. Не прывыклі яны асцерагацца чалавека, забіваць іх лёгка.

— Нішто сабе «паляванне»? — іранічна пытаецца праваднік. — Бяспечнае і бесклапотнае, месье? Ці не праўда? Страляй ды страляй без усякай рызыкі. Нават стрэльбу заражаць такому турысту не трэба, бо гэта абавязак слугі.

Я ўжо даўно заўважыў, што багатых амерыканскіх турыстаў наш добры Анры не вельмі любіць, хоць у матэрыяльных адносінах найбольш ад іх залежыць.

Цяпер паляванне на многіх звяроў забаронена.



Вёска ў Гвінеі. Фота аўтара.

Галоўны рэдактар Нічыпар ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Мікола ТКАЧОЎ, Янка ШАРАХОЎСКІ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск. | АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара—3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва— 3-24-62, аддзела культуры—3-20-54, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі—3-11-03. | «Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу

АТ 00479 Друкарня выдавецтва «Звязда».